153. МОСКВА 19.
УЛ. ФРУНЗЕ 10 ИНСТИТУТ
СОВ. СТРОИТЕЛЬСТВА
И ПРАВА
1. 1.12.36 ЗВЯЗ.2.

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦКі МККП(б)Б, ЦВКі СНК БССР

№ 293 (5667) | 23 снежня 1936 г., серада | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПАМЁР ПІСЬМЕННІК НІКАЛАЙ АЛЕКСЕЕВІЧ ОСТРОЎСКІ.

УСЕСАЮЗНАЯ НАРАДА ЖОНАК КАМАНДНАГА І НАЧАЛЬНІЦКАГА СКЛАДУ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.

ПАРТЫЙНЫ СХОД ПА ПРЫЁМУ Ў ПАРТЫЮ.

ДЗЕСЯЦІГОДДЗЕ МЕНСКАЙ МУЗЫЧНАЙ ШКОЛЫ.

СПЫНІЦЬ РАЗВАЗАРВАННЕ КАЛГАСНАГА СЕНА.

ПАМЯЦІ НІКАЛАЯ ОСТРОЎСКАГА

Абарвалася жыццё цудоўнага чалавека, мастака слова, вядомага совецкаму чытачу літаратара-ордэнаносца. Не стала Нікалая Остроўскага.

Колькі сіл, энергіі, тэмпераманта хавалася ў гэтым чалавеку. Іспалінская сіла волі, цвёрды большэвіцкі дух жылі ў амаль памёршым целе. Остроўскі пачаў працоўнае жыццё яшчэ хлопчыкам. Юнаком прайшоў ён школу грамадзянскай вайны. Пасля фронта ён на актыўнай комсамольскай рабоце. З такім-жа запалам, як і на фронце, ён змагаецца з трацкістамі, адчуваючы ўсю гніль і пакасць, якую трацкізм яшчэ тады таіў у сабе. Але фронт і стомленасць на рабоце лаюць сябе адчуваць. Пачынаецца лячэнне, пераход з аднаго шпіталя ў другі. Чалавек вышаў са строю. Здаецца, на першы погляд, што можа даць чалавек разбіты, пазбаўлены магчымасці перасоўвацца, чалавек, пазбаўлены зроку.

«Што, калі вывесці ў расход, — гаворыць герой кнігі Остроўскага па поваду такой-жа трагедыі жыцця маладога чалавека, — здразіўшае яму цела? Куля ў сэрца — і па ўсім. Умеў не дрэнна жыць, умей у час і скончыць. Хто асуджаны байца, што не жадае біцца ў агоніі?»

Але гэта філасофія працўна совецкай моладзі, сапраўдным прадстаўніком якой быў Нікалай Остроўскі. Упадніцтва — гэта філасофія дробнага буржуа. Гераічная моладзь Совецкага Саюза прайшла з юнацкіх гадоў школу пакут на фронце, вучобы ў цяжкі перыяд, у першыя гады нэпа, школы барацьбы з кулаком за калектывізацыю. Хіба-ж такой моладзі ўласціва ўныніе? Хіба-ж у Совецкім Саюзе можа так бясслешна і па-інтэлігенцку абарвацца жыццё змагара?

Не, не можа! Совецкая краіна, краіна шчасця, краіна, дзе кожны дзень здзіўляюча добры, дзе з кожным днём расце ўпэўненасць у цудоўным заўтра.

У гэтай краіне прынята новая сталінская Канстытуцыя. Канстытуцыя наша гэта—кодэкс шчасця. Канстытуцыя наша гэта — праяўленне бацькоўскіх клопатаў аб чалавеку. Чалавек! Гэта гучыць ва ўсіх артыкулах і літарах Канстытуцыі. Чалавек! Аб ім спявае гэты найвялікшы дакумент, напісаны другам людзей, бацькам працоўных таварышом Сталіным. З пялёнак да канца дзён дзяржава рабочых і сялян клапоціцца аб чалавеку.

Хіба можна ў такой краіне так бяссэнсна спыніць маладому чалавеку, хаця-б нават і цяжкае жыццё цела? Не, нельга.

Жыць, радавацца, жыць і тварыць! Нельга самому, па ўласнаму пачыну, спыніць жыццё ў краіне, дзе жыве і працуе вялікі Сталін, дзе прынята новая, Сталінская Канстытуцыя.

«Дула зняважліва глянула яму ў вочы. Павел палажыў рэвальвер на калені і злосна вылаяўся.

Усё гэта паперовы гераізм, браток. Стукнуць сябе кожны дурань можа заўсёды і ў кожны час. Гэта самы баязлівы і лёгкі выхад са становішча. Цяжка жыць — стукай сабе. А ты паспрабаваў гэта жыццё перамагчы? Ты ўсё зрабіў, каб вырвацца з жалезнага кола? А ты забыўся, як пад Новаград-Валынскам семнаццаць разоў на дзень у атаку хадзілі і ўзялі-такі насуперак ўсяму? Схавай рэвальвер і ніколі нікому пра гэта не расказвай. Умей жыць і тады, калі жыццё робіцца нязносным. Зрабі яго карысным».

Жыць і працаваць! І Нікалай Остроўскі, таксама як і герой яго кнігі, не схіліў галаву, калі настала цяжкая мінута. Ён узяўся за новую для яго работу, за пяро і напісаў выдатны раман.

Кніга Остроўскага — цудоўная паэма аб моладзі Совецкага Саюза. Яна праўды адказ ворагу. З задорам, гарачай верай у сілы свае аўтар даў адказ паклёпнікам, якія цверзілі, што моладзь СССР разгубіла традыцыі мінулага.

Вораг пралічыўся зноў! Совецкая моладзь моцная крапасцю сувязей з партыяй, моцная сваім прагным імкненнем вучыцца ў партыі Леніна—Сталіна змагацца за комунізм, яна моцная тым, што навучалася ў партыі распазнаваць ворагаў, у якую-б тогу яны ні апраналіся. Пад кіраўніцтвам партыі яна ўжо змагалася з трацкістамі—падонкамі грамадства, гадкімі прасмыкаючымися, з правымі апартуністамі — агентамі кулацтва, нацдэмамі і інш. глашатаямі і абаронцамі буржуазных парадкаў.

Остроўскі — чалавек бясстрашнага подвігу, чалавек дзейна насычаны, чалавек велізарнай сілы волі.

Скончылася жыццё большэвіка, чалавека, моцнага духам. Захоўваючы памяць аб гэтым светлым імені назаўсёды ў сэрцах сваіх, будзем вучыцца на яго прыкладзе як трэба змагацца за комунізм.

САМАЯ ДЭМАКРАТЫЧНАЯ КАНСТЫТУЦЫЯ Ў СВЕЦЕ

«Няма ні адной краіны, — гаварыў Ленін 19 сакавіка 1919 года на VIII з'ездзе партыі, — якая зрабіла-б хаця дзесятую долю таго, што зрабіла за прайшоўшыя месяцы совецкая рэспубліка для рабочых і бяднейшых сялян у сэнсе прыцягнення іх да кіравання дзяржавай. Гэта — абсалютная ісціна. Ніхто не стане адмаўляць, што для дэмакратыі сапраўднай, а не папяровай, для прыцягнення рабочых і сялян мы зрабілі столькі, колькі за сотні год не зрабілі самыя лепшыя дэмакратычныя рэспублікі і зрабіць не маглі».

За 18 год, прайшоўшых з таго часу, совецкая дзяржава шагнула яшчэ далей. Сотні тысяч рабочых і сялян за гэты час прайшлі школу дзяржаўнага кіравання, прымаючы ўдзел у рабоце саветаў у якасці членаў яго, загадчыкаў аддзеламі, камісіямі, у якасці членаў секцый саветаў. Дзесяткі тысяч рабочых і сялян прымалі ўдзел за гэты час на раённых, гарадскіх, акруговых, абласных, рэспубліканскіх і саюзных з'ездах саветаў.

У СССР вырашана бойнейшая праблема дэмакратыі: жанчына ў СССР ва ўсіх грамадзянскіх правах ўроўнена з мужчынам. Жанчына мае права выбіраць і быць выбранай у саветы. Шмат жанчын прымае ўдзел у кіруючай рабоце саветаў, прамысловасці, культуры.

Не карысталіся ў СССР правам выбіраць і быць выбранымі эксплаататары і былыя эксплаататары, чыны паліцыі, служыцелі культу. Абаронцы чыстай дэмакратыі, а па сутнасці справы абаронцы буржуазнай дэмакратыі, дэмакратыі для багатых, заўсёды ставілі нам гэта ва ўпрок.

У адказ ім Ленін гаварыў: «Свабоды для буржуазіі мы не хочам, роўнасці эксплаататараў і эксплаатуемых мы не прызнаем».

Совецкая рэспубліка нарадзілася ў жорсткай барацьбе з буржуазіяй. Яшчэ пры Керэнскім буржуазія, каб аказаць даўленне на часовы ўрад, арганізавала сабатаж і вышла з саветаў, куды прыцягнулі яе меншавікі і эсэры. «Буржуазію да Кастрычніцкай рэволюцыі і пасля яе ніхто з саветаў не выганяў. **Буржуазія сама ўшла ад саветаў»** (Ленін). Гэта фактычнае становішча і замацавала першая Канстытуцыя совецкай дзяржавы.

Грамадзянская вайна і ўвесь ход социялістычнага будаўніцтва паказалі ўсю каштоўнасць гэтай меры народу супроць буржуазіі. Капіталісты і памешчыкі, кулакі і растаўшчыкі прыбягалі да самых хітрых ўлоўкаў, да самай дзікай расправы над рабочымі і сялянамі, каб уплываць на саветы. Стральба з-за вугла, кол, сякера, падпал, агітацыя, подкуп — усе сродкі скарысталі ворагі для барацьбы з саветамі. У жорсткай барацьбе рабочы клас пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна разграміў ворага, пазбавіў яго эканамічнай базы.

Індустрыялізацыя, калгасы, соўгасы— вось што забяспечыла замену кулацкай вытворчасці вытворчасцю социялістычнай. Цяпер у СССР няма класа эксплаататараў, няма класа, які жыве працай рабочых і сялян. У СССР няма кулака, памешчыка і капіталіста — яны знішчаны. Чорная армія — папы, равіны і іншыя служыцелі рэлігійнага культу — гэтыя ў мінулым і ў сучасным прыслужнікі буржуазіі — не маюць ужо той сілы, таго ўплыву, які яны мелі раней.

Па старой канстытуцыі, аднак, не толькі буржуазія была пазбаўлена выбарчых правоў. Па ёй і сялянства не мела роўнага права з рабочымі. Голас рабочага тады раўняўся пяці галасам сялян. Працоўныя, прымаючы Канстытуцыю, гэтай мерай узаконьвалі кіруючую ролю рабочага класа.

Цяпер сялянства, уступіўшы ў калгасы, культурна вырасла, загартавалася ў баях з ворагам, за калектывізацыю. Сваю перамогу яно справядліва лічыць перш за ўсё перамогай рабочага класа, лічачы яго сваім правадыром і кіраўніком. Праграму і мэты рабочага класа, які колькасна ўзрос у тры разы, калгаснае сялянства лічыць сваёй праграмай і палітыкай. У сувязі з гэтым стала неабходнасць у спецыяльным папярджэнні кіруючай ролі рабочага класа. Вось чаму ў новай, Сталінскай Канстытуцыі рабочыя і сяляне ўроўнены ў выбарчых правах, вось чаму былым эксплаататарам, якія цяпер працуюць на прадпрыемствах або вядуць аднаасобную сялянскую гаспадарку, без усякай небяспекі за лёс дзяржавы, новая Канстытуцыя дае права выбіраць у выбарчыя органы ўлады.

Уводзячы ўсеагульнае выбарчае права, совецкая дзяржава ні на адзін крок не адступае ад ўказанняў партыі Леніна. У праграме партыі, напісанай Леніным і зацверджанай VIII З'ездам партыі па дакладу В. І. Леніна, ўказана: «Пазбаўленне палітычных правоў і якое-б то ні было абмежаванне свабоды неабходны выключна ў якасці часовых мер барацьбы са спробамі эксплаататараў адстаяць ці аднавіць свае прывілеі. Па меры таго як будзе знікаць аб'ектыўная магчымасць эксплаатацыі чалавека чалавекам будзе знікаць і неабходнасць у гэтых часовых мерах, і партыя будзе імкнуцца да звужэння і да поўнай іх адмены».

Новая Канстытуцыя ўроўнівае рабочага і селяніна, дае права выбіраць і быць выбраным ва ўсе органы совецкай улады, пачынаючы з ніжэйшых, канчаючы вышэйшымі, усім грамадзянам СССР, дасягнуўшым 18 год, калі яны не пазбаўлены гэтага права па суду і не з'яўляюцца разумова непрамальнымі.

З увядзеннем гэтых правоў усе грамадзяне СССР могуць прыняць удзел у кіраўніцтве дзяржавай. Аб такіх правах людзі да гэтага часу толькі марылі. Такіх правоў няма ні ў адной краіне. І гэта характарызуе новую совецкую Канстытуцыю, як самую дэмакратычную Канстытуцыю ў свеце, як праяўленне небывалых да гэтага часу клопатаў дзяржавы аб сваіх грамадзянах.

Пытаюць звычайна, як-жа быць, калі вораг пралезе ў совецкія органы? Зразумела, вядома, што нават калі-б ён і пралез у совет, то кола гісторыі яму не ўдасна павярнуць назад. Аднак трэба памятаць, што калі вораг наогул небяспечны нам, то вораг у совеце ўдвое небяспечней, ён можа моцна пашкодзіць нам. Вось чаму зараз неабходна працаваць і працаваць усім органам совецкай улады, усім грамадскім арганізацыям. Нельга забываць указанні таварыша Сталіна на Надзвычайным VIII З'ездзе Саветаў па гэтаму поваду.

Таварыш Сталін гаварыў: «Калі народ дзе-ні-дзе і выбірае варожых людзей, то гэта будзе азначаць, што наша агітацыйная работа пастаўлена з рук вон дрэнна, і мы ўпаўне заслужылі такую ганьбу, калі-ж наша агітацыйная работа будзе ісці па-большэвіцку, то народ не прапусціць варожых людзей у свае вярхоўныя органы. Значыць, трэба працаваць, а не хныкаць **(бурныя апладысменты)**, трэба працаваць, а не чакаць таго, што ўсё будзе прадастаўлена ў гатовым выглядзе, у парадку адміністрацыйных распараджэнняў».

Рабочыя і сяляне ведаюць, што перамогі социялізма забяспечыла комуністычная партыя і, вядома, давяраюць, перш за ўсё, комуністам і непартыйным большэвікам — актыўным барацьбітам за справу социялізма. Адкрытага ворага рабочыя і сяляне не выберуць ні ў саветы ні ў якую-небудзь грамадскую арганізацыю. Але вораг хітры, ён апранаецца ў маскі, прыкідваецца прыяцелем, галасуе за лінію партыі, выступае з прамовамі. Такога ворага працоўныя, вядома, могуць і выбраць. Вінаваты будуць у гэтым, перш за ўсё, комуністы гэтага раёна. Факт абрання скрытага ворага будзе сведчаннем таго, што агітацыя пастаўлена дрэнна, што тут змагаюцца супроць ворага наогул, не ўскрываючы і не выкрываючы канкрэтных ворагаў.

Рабочыя і сяляне ведаюць, што заядлыя ворагі народу, трацкісты, выпрацавалі гэты метад, названы партыяй двурушніцтвам, для барацьбы з партыяй і дзяржавай. Гэтым прыёмам карыстаюцца правыя апартуністы — агенты кулака, прышчэпаўцы, як і ўсе нацыяналісты, як і ўсе ворагі. Ён дазваляе ворагам народу ўлезці ў давер'е, ашукаць працоўных прадставіцца іх прыяцелямі. Выкрываць іх, папярэджваць працоўных, паведаміць ім аб тым, што нарабілі трацкісты, правыя апартуністы — агенты кулака, кулакі, нацыяналісты і белагвардзейцы ў даным сельсавеце, у даным раёне, акрузе паказаць канкрэтна ў асобах — вось задача партыйных і совецкіх арганізацый вось цэнтральнае звяно агітацыі.

Грамадзянам СССР прадастаўлена ўсеагульнае выбарчае права. Гэта права трэба забяспечыць. Яно павінна няўхільна праводзіцца ў жыццё ўсімі арганізацыямі. Разам з тым, у нашай гаспадарчай рабоце і калгасным будаўніцтве трэба памятаць указанне Леніна, што «той, хто разумее пераход да социялізма без падаўлення буржуазіі, той — не социяліст. Але калі буржуазію, як клас, падаўляць неабходна, то пазбаўляць яе выбарчых правоў і роўнасці не неабходна».

Н. А. ОСТРОЎСКІ

Праўленне саюза совецкіх пісьменнікаў СССР з глыбокім жалем паведамляе аб смерці члена саюза пісьменніка-ордэнаносца НІКАЛАЯ АЛЕКСЕЕВІЧА ОСТРОЎСКАГА.

Не стала таленавітага мастака, большэвіка, чыё гераічнае жыццё і дзейнасць служаць узорам для ўсіх совецкіх пісьменнікаў.

«Як гартавалася сталь» — стала любімай кнігай народаў Совецкага Саюза. У гэтай кнізе ўвасоблены высокія комуністычныя ідэалы, праўдзіва аллюстравана вялікая барацьба працоўных за социялізм.

Гэта кніга натхніе мільёны, яна вучыць беззаветнай адданасці справе комунізма.

Усё сваё жыццё Нікалай Остроўскі аддаў рэволюцыі. Да апошняй мінуты ён не спыняў творчай работы, заканчваючы свой новы раман аб грамадзянскай вайне «Народжаныя бурай».

Ушоў ад нас выключны большэвік, выключны друг і таварыш, чалавек светлага розуму, незвычайнай мужнасці, кіпучай энергіі.

Бывай, таварыш!

Праўленне ССП СССР.

На Усесаюзнай нарадзе жонак камандзнага і начальніцкага складу РСЧА. НА ЗДЫМКУ: таварышы Сталін і Варашылаў на нарадзе.

Фото Ф. Кіслова (СФ).

Перадана з Масквы для «Звязды» па біяздапарату Беларускага кіраўніцтва сувязі.

УСЕСАЮЗНАЯ НАРАДА ЖОНАК КАМАНДНАГА І НАЧАЛЬНІЦКАГА СКЛАДУ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Вячэрняе пасяджэнне 21 лістапада

Вячэрняе пасяджэнне Усесаюзнай нарады жонак камандзнага і начальніцкага складу РСЧА адкрываецца пад старшынствам тав. **Угальковай.**

Першай выступае дэлегатка жонак камандзіраў Паўночнай морскай флатыліі тав. **М. М. Байрачная.** Яна перадае палкае прывітанне правадыру народаў таварышу Сталіну, любімаму наркому першаму маршалу Совецкага Саюза таварышу Варашылаву.

З вялікім узлымам тав. Байрачная расказвае, як у Запаляр'і, на 68—70-й паралелі, слухалі выдатны даклад таварыша Сталіна аб праекце новай Канстытуцыі СССР. Даклад слухалі ўсюды — на караблях, на базах, у кватэрах.

— Сталінская Канстытуцыя, — гаворыць т. Байрачная, — прынесла нам зелізарнае шчасце і радасць.

Яна напамінае аб прыездзе тры гады таму назад таварышоў Сталіна, Варашылава і Кірава ў Запаляр'е і гаварыць, што гэты прыезд, увага таварыша Сталіна да патрэб края запалілі энтузіязмам працоўных Запаляр'я.

Многа любві і старання ўкладваюць жонкі камандзіраў Паўночнай флатыліі ў абаронную справу, у стварэнне моцнага фарпоста краіны социялізма на Поўначы.

Тав. Байрачная ад імя жонак камандзіраў Паўночнай морскай флатыліі падносіць падарункі таварышам Сталіну і Варашылаву.

Слова даецца жонцы старшага лейтэнанта Сібірскай ваеннай акругі тав. Н. М. **Сысойкінай.**

—Вайсковая часць, з якой я прыехала,—гаворыць яна, — перадавая ў Сібірскай ваеннай акрузе. Яна трымае сцяг Кузбаса. У гэтым ёсць і доля нашай жаночай працы. Жонкі камандзіраў клопоцяцца аб паляпшэнні грамадскага харчавання, аб арганізацыі падсобнай гаспадаркі, павышаюць свой культурны ўзровень.

Бурнымі доўгімі апладысментамі суправаджаюцца яе заключныя словы, калі яна перадае таварышу Сталіну падзяку за радаснае, шчаслівае жыццё і ўручае прэзідыуму партрэт таварыша Сталіна, зроблены калектывам жонак камандзіраў у 60 чалавек. Гэты партрэт складаецца з 30 тыс. маленькіх вышытых кветачак. Жонкі камандзіраў прапавалі над ім 2 з паловай месяцы.

У гэты момант у прэзідыуме з'яўляецца таварыш Варашылаў, якому ўсе ўдзельніцы нарады наладжваюць гарачую авацыю.

Тав. Сысойкіна перадае ў прэзідыум такім-жа спосабам выкананы партрэт таварыша Варашылава.

Доўгай авацыяй, прывітальнымі воклічамі сустракае нарада з'явіўшагася ў прэзідыуме тав. Л. М. Кагановіча.

Жонка камандуючага Амурскай флатыліяй тав. Ю. К. **Руднёва** ад імя камандзіраў, іх жонак і дзяцей, байцоў і рабочых, якія жывуць на базе Амурскай флатыліі, перадае таварышам Сталіну, Варашылаву і совецкаму ўраду баявое чырвонафлоцкае прывітанне.

— Мы перажываем зараз, — гаворыць яна, — самыя шчаслівыя дні нашага жыцця. Мы бачылі ўчора і сёння Сталіна. Прызнаюся, па сваёй жаночай слабасці мы нават плакалі, калі ўбачылі нашага блізкага, роднага, любімага Сталіна.

Тав. Руднёва гаворыць далей аб вялікіх клопатах і ўвазе таварышоў Сталіна і Варашылава да патрэб Далёкага Ўсхода.

Заключныя словы тав. Руднёвай тонуць у буры авацый. Раздаюцца прывітальныя воклічы ў гонар тав. Сталіна, тав. Варашылава, Чырвонай Арміі.

— Нашу нараду прышла вітаць дэлегацыя жонак камандзіраў-пагранічнікаў, — аб'яўляе старшынствуючая тав. Угалькова.

Мінутная цішыня прарываецца гарачымі воплескамі. На трыбуне — жонка капітана пагранічнага Чырвонасцяжнага Таджыкскага атрада тав. **З. П. Кулькова.**

Перадаўшы палкае прывітанне ўдзельніцам нарады, яна гаворыць:

— Мы рады вітаць вас, гарачых патрыётак нашай радзімы, тых, хто змагаецца за росквіт вялікай социялістычнай дзяржавы. Мы ўсе разам са сваімі мужамі і братамі прымаем удзел у будаўніцтве социялізма, умацоўваем абароназдольнасць нашай краіны. На далёкіх заставах жанчыны ствараюць утульнасць, забяспечваюць лепшыя ўмовы для трудной работы пагранічніка. А нашы пагранічнікі на справе паказалі, што ні адной пядзі сваёй зямлі мы не аддамо нікому.

Пры бурных авацыях ўсёй залы тав. Варашылаў, перагнуўшыся праз стол прэзідыума, вітаецца за руку з ўсімі ўдзельніцамі дэлегацыі жонак пагранічнікаў. Нясуцца воклічы «ўра» і гарачыя прывітанні.

Шумнымі апладысментамі сустракаюць дэлегаткі воклічы:

«Няхай жыве народны камісар унутраных спраў Саюза тав. Ежоў!».

Заключнае, поўнае захапленне прывітанне ў гонар правадыра народаў тав. Сталіна тоне ў буры апладысментаў і грамавым «ура».

(Працяг гл. на 2 стар.)

ПРАЦОЎНЫЯ БССР АБУРАНЫ БАНДЫЦКІМ НАПАДАМ ФАШЫСЦКІХ МЯЦЕЖНІКАЎ НА ЦЕПЛАХОД „КОМСОМОЛ"

Абуздаць фашысцкіх варвараў

БАРЫСАЎ, 22 снежня. **(Па тэлефону ад спец. кар. «Звязды»).** З вялікім абурэннем сустрэлі працоўныя Барысаўскага раёна паведамленне аб тым, што іспанскія фашысты спалілі і патапілі совецкі цеплаход «Комсомол». На ўсіх фабрыках, заводах, ва ўсіх установах, калгасах і сельсоветах раёна адбыліся шматлюдныя мітынгі. На іх працоўныя выносяць жорсткія пратэсты супроць гнусных дзеянняў іспанскіх фашысцкіх мяцежнікаў.

На мітынгу рабочых фанернага завода № 21 выступіў стаханавец Грыгонік:

— Іспанскія фашысцкія мяцежнікі шукаюць новых шляхоў для вайны з намі, — гаворыць ён. — Мы, рабочыя, рашуча пратэстуем супроць наглай бандыцкай правакацыі і бярэм на сябе абавязацельствы ўзмацніць абаронную работу.

Рабочыя запалкавай фабрыкі імя Кірава ў прынятай рэзалюцыі пішуць: «Фашысцкія бандыты, напаўшы ў адкрытым моры на беззбройных людзей, праявілі не гераізм, а сапраўдную трусасць. Няхай фашысты памятаюць, што для іх прыйдзе дзень расплаты і нікуды не уйсці ім ад суровай адказнасці».

В. АСТРОЎСКІ.

Гатовы абараняць сваю радзіму

ВІЦЕБСК. **(Па тэлефону ад спец. кар. «Звязды»).** З вялікім абурэннем сустрэлі працоўныя Віцебска паведамленне аб затапленні іспанскімі бандытамі нашага цеплахода «Комсомол». На радзе прадпрыемстваў горада адбыліся масавыя рабочыя мітынгі пратэсту супроць варварства фашысцкіх разбойнікаў. На рабочым мітынгу фарбовачнага цэха панчошна-трыкатажнай фабрыкі «КІМ» работніца тав. Стэркіна з хваляваннем заявіла:

— Увесь наш васьмітысячны рабочы калектыў фабрыкі «КІМ» глыбока абуран гнусным дзеяннем іспанскіх фашыстаў. Ужо не першы раз іспанскія мяцежнікі прабуюць нападаць на совецкія судны. Рад нашых совецкіх суднаў без усякай падставы, наперакор міжнародным правілам суднаходства, падвяргаліся беззаконнаму арышту і вобыскам з боку фашысцкіх піратаў. Факт затаплення цеплахода «Комсомол» пераўзыходзіць усякія граніцы і выклікае глыбокае абурэнне і нянавісць шматмільённага совецкага народу.

На пэхавых мітынгах аднадушна прынята рэзалюцыі, у якіх васьмітысячны рабочы калектыў фабрыкі «КІМ» звяртаецца да свайго ўрада аб прыняцці самых рэзкіх мер да абуздання фашысцкіх варвараў, якія сваімі гнуснымі дзеяннямі хочуць справакаваць Совецкі Саюз на новую сусветную вайну, але гэта ім не ўдасца. Совецкі ўрад цвёрда стаіць і адстойвае палітыку міру. Падпальшчыкам вайны мы заўсёды гатовы даць сакрушальны адпор.

Аналагічныя мітынгі прайшлі на ўсіх прадпрыемствах гор. Віцебска.

ОФЕНГЕЙМ, ЗАРУБЕЖНЫ.

ДЗЕ БЫЎ ПАТОПЛЕН ЦЕПЛАХОД „КОМСОМОЛ"

Як высвятляецца, разбойніцкая расправа фашысцкіх піратаў з совецкім цеплаходам «Комсомол» адбылася за 130 міль ад Алжыра (паўночная Афрыка). Незадоўга да гэтага з «Комсомолом» падтрымліваў радыёсувязь совецкі пароход «Кузбасс», які ішоў з Атлантычнага акіяна ў італьянскі порт Ліворно. Затым «Комсомол» перастаў адказваць на выклікі. У хуткім часе «Кузбасс» прыняў радыёграмы з замежных суднаў аб тым, што яны бачылі палаючае судно, як відаць, совецкае.

«Кузбасс» зараз-жа звярнуў са свайго курса і накіраваўся да таго месца, дзе павінен быў знаходзіцца «Комсомол». Аднак, у гэтым раёне ён выявіў на паверхні мора толькі сляды нафты і масла.

Заўважыўшы на гарызонце піратскі крэйсер мяцежнікаў, які набліжаўся, «Кузбасс» зараз-жа пайшоў сваім курсам і паспяхова прыбыў у Ліворно.

(«Известия»).

Вымыслы аб адпраўцы совецкіх ваенных караблёў у іспанскія воды

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 21 снежня. (БЕЛТА). Агенцтва Рэйтэр перадае: «Як паведамляюць, 13 совецкіх ваенных караблёў атрымалі загад выйсці з Одэсы ў іспанскія воды і адкрываць стральбу, калі мяцежнікі будуць перашкаджаць совецкаму суднаходству.

АБВЯРЖЭННЕ ТАСС

Паведамленне, распаўсюджваемае ваенныя караблі атрымалі загад выйсці ў агенцтвам Рэйтэр, аб тым, што совецкія іспанскія воды, не адпавядае сапраўднасці і з'яўляецца суцэльным вымыслам.

ЗАБАСТОЎКІ НА ГЕРМАНСКІХ ЗАВОДАХ

ПАРЫЖ. 20 снежня. (БЕЛТА). Орган Компартыі «Юманітэ» паведамляе, што ў Дрэздзене (Германія) арыштавана каля 60 рабочых за ўдзел у забастоўцы на заводзе, які працуе для ваенных патрэб.

Яшчэ 80 рабочых арыштаваны за ўдзел у другой забастоўцы. Нездавальненне сярэдніх пластоў насельніцтва, рабочых і сялян узмацняецца па ўсёй Германіі. Шмат арыштаў і вобыскаў праведзена сярод членаў арганізацыі «Сталёвага шлёма», прымусовым працам уключаных у склад штурмавых атрадаў. Паведамляюць таксама аб арышце многіх афіцэраў

УСЕСАЮЗНАЯ НАРАДА ЖОНАК КАМАНДНАГА І НАЧАЛЬНІЦКАГА СКЛАДУ РСЧА

Працяг дзённіка вячэрняга пасяджэння 21 снежня

Наступнай выступае тав. С. Ф. **Ліксонава** — жонка старшага палітрука з Беларускай ваеннай акругі. Яна — дэлегатка з заходніх граніц нашай радзімы з вялікім энтузіязмам расказвае, як часці акругі мацуюць абарону заходніх рубяжоў, як жонкі камандзіраў прымаюць удзел у абароннай рабоце.

У часе прамовы тав. Ліксонавай у прэзідыуме паяўляецца тав. Орджанікідзе. Удзельніцы нарады сустракаюць камандарма цяжкай прамысловасці хвалай гарачых і шумных прывітанняў.

Цытуючы асобныя месцы з пісьма беларускага народу да вялікага Сталіна, тав. Ліксонава гаворыць аб вялікім шчасці ўсведамляць, што стаіш на той трыбуне, з якой нядаўна выступаў на гістарычным З'ездзе Саветаў мудры правадыр народаў, любімы бацька і друг таварыш Сталін.

Калі тав. Ліксонава заканчвае сваю прамову, група дэлегатак Беларускай ваеннай акругі ўносіць у залу падарункі для таварышоў Сталіна, Молатава і Варашылава.

У другой палове вячэрняга пасяджэння ў Вялікую залу Крэмлёўскага палаца прыбыла дэлегацыя жонак камандзіраў, інжынераў і стаханаўцаў-крываносаўцаў чыгуначнага транспарту. Ад іх імя выступіла з прывітаннем тав. Крыванос, жонка ініцыятара выдатнага руху на транспарце.

Затым удзельніц нарады вітала дэлегацыя жонак. гаспадарнікаў і інжынерна-тахнічных работнікаў народных камісарыятаў цяжкай індустрыі і абароннай прамысловасці. Ад імя жонак—грамадскіх работніц з гарачай і яркай прамовай выступіла тав. Веснік.

Абедзве дэлегацыі перадалі прэзідыуму падарункі і ўручылі прысутным на пасяджэнні таварышу Сталіну, кіраўнікам партыі і ўрада букеты кветак.

Ранішняе пасяджэнне 22 снежня

Святочна прыўзняты настрой, ахапіўшы ўдзельніц нарады ў памятны для іх вечар першай сустрэчы з таварышам Сталіным, не пакідае дэлегатак. Кожны раз, калі з трыбуны ўпамінаецца імя вялікага правадыра народаў, бура авацый, прывітальных воклічаў, крыкаў «ура» гыміць нясціханна ў зале.

Пасяджэнне адкрывае тав. **Судзьбіна**, якая дае слова тав. **Мазух** — жонцы палітрука Харкаўскай ваеннай акругі. Сваю прамову тав. Мазух пачынае словамі прывітання на украінскай мове па адрасу таварышоў Сталіна і Варашылава, вялікай комуністычнай партыі і нарады жонак камандзіраў.

Ад імя жонак камандзіраў Харкаўскай ваеннай акругі тав. Мазух перадае ў прэзідыум падарункі для таварышоў Варашылава і Гамарніка.

На трыбуну ўзыходзіць жонка палкоўніка з Паўночна-Каўказскай ваеннай акругі тав. А. І. **Калугіна**. Яна ўжо на працягу 16 год вядзе вялікую грамадскую работу ў Чырвонай Арміі, пачаўшы яе на фронце ў Дагестане ў 1920 годзе. З вялікім задавальненнем яна гаворыць аб тым, што адзін з яе былых выхаванцаў— чырвонаармеец, якога яна навучыла грамаце, стаў цяпер інжынерам; што дзіцячы сад, у якім яна працуе, стаў лепшым у акрузе і ў Азова-Чорнаморскім краі. Тав. Калугіна дае слова таварышам Сталіну і Варашылаву, што жонкі камандзіраў выхаваюць яшчэ многа тысяч моцных, валявых совецкіх людзей, дастойных сталінскай эпохі.

Бурнымі апладысментамі сустракае нарада наступнага аратара — ваеннага ўрача кіеўскага ваеннага шпіталя Ольгу Петроўну **Катоўскую** — жонку легендарнага героя грамадзянскай вайны Г. І. Катоўскага.

Яна перадае палкае прывітанне нарадзе ад жанчын — удзельніц грамадзянскай вайны, расказвае, як совецкія жанчыны плячом к плячу з мужамі, бацькамі і братамі ішлі на барыкады і на франты грамадзянскай вайны.

У часе прамовы тав. Катоўскай ў прэзідыуме паяўляецца тав. Калінін, якога нарада сустракае шумнай авацыяй.

У залу ўваходзіць дэлегацыя жонак палярнікаў, работнікаў Паўночнага марскага шляху. У руках яны трымаюць велізарныя букеты кветак. У складзе дэлегацыі: Вера Фёдараўна Шміт, жонкі герояў Совецкага Саюза Молакава, Леванеўская, Дароніна, жонкі вядомых палярнікаў Бабушкіна, Крэнкель, Папаніна і інш.

Ад імя жонак маракоў, лётчыкаў, зімоўшчыкаў, якія асвойваюць вялікі сталінскі Паўночны морскі шлях, нараду вітае тав. А. С. **Бергавінава**.

Дэлегацыя паціскае рукі таварышам Варашылаву і Гамарніку і перадае ў прэзідыум букеты кветак.

Нарада цёпла праважае жонак палярнікаў.

Ад жонак камандзіраў часці, размешчанай у адным з аддалёных раёнаў Забайкалля, выступае тав. О. І. **Будзіліна**. Нарада з цікавасцю слухае расказ аб тым, як у самых далёкіх кутках любімай радзімы цвіце шчаслівае жыццё.

У залу ўваходзіць дэлегацыя работнікаў мастацтва, сустракаемая доўгай авацыяй.

На трыбуне народная артыстка рэспублікі тав. В. Н. **Пашэнная**. На яе сяброўскае прывітанне ад стотысячнай арміі работнікаў мастацтва нарада адказвае бурай гарачых воплескаў і дружным «ура».

Грамавая авацыя і вокліч «ура» заключаюць прамову тав. Пашэннай, калі яна агалашае:

— Няхай жыве горача любімы, родны, вялікі Сталін!

Тав. Е. Г. **Карамышэва** — жонка батальённага камісара — дзеліцца вопытам прапагандысцкай, грамадска-абароннай работы жанчын на сяле, гаворыць аб значэнні работы жаночага актыва, які адыграў не малую ролю ў калгасным будаўніцтве.

Гарачае, сардэчнае прывітанне нарадзе перадае тав. П. Я. **Кавалёва** — жонка капітана Кіеўскай ваеннай акругі.

Слова даецца тав. **Івановай**. Яе прапанова — паслаць прывітанне старшыні Совета Народных Камісараў СССР Вячаславу Міхайлавічу Молатаву — сустракаецца з велізарным уздымам, доўга незмаўкаючай авацыяй. Нясуцца воклічы:

— Вялікаму Сталіну — ура!

Таварышу Молатаву — ура!

Затым з вялікім уздымам нарада прымае прывітанне старшыні ЦВК Саюза ССР Міхаілу Іванавічу Калініну. Зачытаны тав. **Кабранавай** тэкст прывітання, зала сустракае поўнымі захаплення воплескамі ў гонар усесаюзнага старасты, у гонар кіраўнікоў партыі і ўрада.

Слова мае тав. **Несцерэнка**, якая прапануе паслаць прывітанне Кліменту Ефрэмавічу Варашылаву. Авацыя ўспыхвае з новай сілай. З усіх радоў залы нясуцца бурныя апладысменты, звонкае «ура» жалезнаму палкаводцу і правадыру Чырвонай Арміі.

На гэтым раніцняе пасяджэнне аб'яўляецца закрытым.

(БЕЛТА).

Н. А. ОСТРОЎСКІ

Таленавіты мастак, барацьбіт, друг

У грозныя дні грамадзянскай вайны, як верны сын свайго народу, са зброяй у руках, будучы яшчэ зусім маладым, рынуўся ў бой на ворага Нікалай Остроўскі.

У баях, у лютых схватках з акупантамі, ён гартаваўся як сталь. У атаках вырастала пачуццё палкай любві да сваёй радзімы і велізарнейшай нянавісці да ворагаў — носьбітаў чорнай няволі.

Якасці барацьбіта, народжаныя ў агні грамадзянскай вайны, Нікалай Остроўскі перанёс у совецкую мастацкую літаратуру.

Гэтыя рэволюцыйныя якасці яскрава вылучалі Нікалая Остроўскага, як пісьменніка: яны жывуць у кожным сказе, у дыханні кожнага героя яго рамана «Як гартавалася сталь», яны запаляюць чытача гэроікай барацьбы і перамог, яны заваявалі пісьменніку заслужаную славу і любоў народу.

Заўчасна абарвалася жыццё пісьменніка, народжанае бурай. Не стала мастака слова, барацьбіта, друга ў такія радасныя, светлыя дні.

Ясны вобраз пісьменніка, героя-ордэнаносца будзе заўсёды ў нашым сэрцы, як і заўсёды будуць жывымі і захапляючымі старонкі кнігі «Як гартавалася сталь» для многіх пакаленняў шчаслівай і расцвітаючай нашай радзімы.

Андрэй АЛЕКСАНДРОВІЧ.

Нікалай Остроўскі.

Вялікі чалавек і пісьменнік

Спі спакойна, наш дарагі друг. Мы ўсе ведалі, што няўмольная хвароба твая незлічыма, але, бачачы тваю магутную барацьбу са смерцю, твой прыклад мужнасці большэвіка і настойлівую творчую работу на карысць сваёй вялікай радзімы, хацелася верыць у тваё доўгае жыццё.

Арганізм не вытрымаў. Ты адышоў ад нас. Спі спакойна, наш цудоўны друг. Ты аддаў для партыі ўсё сваё жыццё. Успамінаеш цябе, і мімаволі падкатваюцца слёзы. Але не трэба іх. Дружней за работу! Трэба замяніць, бо нас пакінуў вялікі чалавек і пісьменнік.

П. БРОЎКА.

Адданейшы сын ленінска-сталінскай партыі

Бясчасная смерць вырвала з нашых радоў адданейшага сына вялікай ленінска-сталінскай партыі.

Высокаталенавіцейшы пісьменнік, энтузіяст-грамадзянін, ён цалкам аддаў сваё маладое, гарачае сэрца новай людской грамадзе. Не гледзячы на сваё асабістае няшчасце, як страта зроку, ён знайшоў у сябе сілы перамагчы гэта няшчасце і з чыста юнацкім запалам, з выключнай адданасцю змагаўся за новае соцыялістычнае жыццё, за новага чалавека.

Для нас, пісьменнікаў, ён — жывы прыклад таго, як трэба жыць, тварыць і змагацца за вялікую непераможную справу Леніна — Сталіна.

Якуб КОЛАС.
Народны паэт рэспублікі.

Яркі прыклад цудоўнага гераічнага жыцця

«Самае дарагое ў чалавека — гэта жыццё, яно даецца адзін раз, і пражыць яго трэба так, каб не было пакутліва балюча за бяз мэты пражытыя гады, каб не паліла ганьба за подленькае і дробязнае мінулае і, каб, памёраючы, змог сказаць: усё жыццё і ўсе сілы былі аддаены самаму найпрыгожаму ў свеце — барацьбе за вызваленне чалавецтва». Так гаварыў адзін з герояў рамана Нікалая Остроўскага «Як гартавалася сталь». Так гаварыў аўтар. Гэтыя словы мы поўнасцю адносім да яго, стварыўшага такую трагічную і разам з тым такую радасную, светлую і бадзёрую эпапею барацьбы пролетарыята за сваю светлую будучыню.

Бязмежная любоў да свайго класа, палючая нянавісць да ворагаў, непахісная воля да перамогі ў барацьбе — і зброяй, і мастацкім словам, незгасаючая вера ў лепшую будучыню чалавецтва, суровая мужнасць барацьбіта, дух якога не магла зламаць трагедыя хворага цела, самаадданасць — да апошняй кроплі крыві сваёй радзіме, свайму народу, — такі паўстае перад намі велічны вобраз пісьменніка, барацьбіта, якога сёння няма ўжо ў жывых сярод нас.

Спі-ж, слаўны, дарагі і любімы таварыш. Памяць аб табе, аб тваім жыцці, аб тваёй рабоце будзе вечнай сярод нас.

Міхась ЛЫНЬКОЎ.

Невычарпальная крыніца аптымізма

Вялікая ўтрата пасцігла нас. У асобе Нікалая Остроўскага совецкая літаратура ўтраціла аднаго са сваіх слаўнейшых пісьменнікаў, чыё выдатнае імя гаварыла аб цэльнасці і гарманічнасці тварца і грамадзяніна, чыё імя зрабілася выяўленнем лепшых якасцей кастрычніцкага пакалення пісьменнікаў, «народжанага бурай» і выхаванага партыяй.

Совецкі чытач утраціў аднаго са сваіх любімейшых совецкіх пісьменнікаў, чыі кнігі і справы натхняюць і жывяць вялікім аптымізмам.

Цяжкая і доўгая хвароба Нікалая Остроўскага змагла зламіць толькі яго цела. Нікалай Остроўскі застаецца для нас, совецкіх пісьменнікаў, узорам шчырасці ў творчасці і бязмежнай веры ў сілы пролетарыята і дзеянні Кастрычніцкай рэволюцыі.

Вечная памяць Нікалаю Остроўскаму, любімаму пісьменніку, шчыраму другу шматмільённага і шматнацыянальнага совецкага чытача.

Ізі ХАРЫК.

СПЫНІЦЬ РАЗБАЗАРВАННЕ КАЛГАСНАГА СЕНА

У калгасе «Чырвоны кут», Малошкавіцкага сельсовета, Клімавіцкага раёна, многа сенажаці. Вакол калгаса лясы. Калгасную жывёлу можна было забяспечыць удосталь кармамі на ўсю зіму.

Што-ж атрымалася на справе? Старшыня калгаса Скачкоў здаў у арэнду большасць сенажаці аднаасобнікам суседніх сельсоветаў. Яны скасілі сенажаць. Зараз штодзённа прыязджаюць аднаасобнікі з Печарскага сельсовета, суседняга Касцюковіцкага раёна, і Забелычанскага сельсовета, Хопімскага раёна, і забіраюць калгаснае сена. За тыдзень вывезлі каля 800 пудоў сена.

Кармавы баланс у калгасе не складзён. Ужо зараз нехапае кармоў. Коні і кароўы ніжэй сярэдняй упітанасці. 4 конематкі з прычыны дрэннага догляду абартавалі.

Паўстае пытанне, хто даў права старшыні калгаса раздаваць у арэнду калгасную сенажаць і груба парушаць статут сельгасарцелі.

Неабходна зараз-жа скасаваць незаконныя арэндныя дагаворы, заключаныя Скачковым з аднаасобнікамі і спыніць разбазарванне калгасных кармоў.

КЛІМАВІЦКІ.

УКЛЮЧЫЛІСЯ ВА УСЕСАЮЗНАЕ СПАБОРНІЦТВА ЗА ВЫСОКІ УРАДЖАЙ

ГОМЕЛЬ. (**Кар. «Звязды»**). Бюро гомельскага гарадскога камітэта партыі абмеркавала зварот перадавікоў па ўраджайнасці, якія былі скліканы на пасяджэнне пленума зернавой секцыі Усесаюзнай Акадэміі сельскагаспадарчых навук імя Леніна, аб арганізацыі ўсесаюзнага спаборніцтва за рэкордны ўраджай калгасных палёў.

Гарком намеціў канкрэтныя мерапрыемствы па ўключэнню калгасаў Гомельшчыны ў соцыялістычнае спаборніцтва. У сельсоветы пасланы прадстаўнікі партыйна-совецкага актыва для арганізацыі абмеркавання ўсесаюзнага спаборніцтва.

У раёне склікаецца нарада аграномаў Гомельшчыны, на якой будзе распрацавана агратэхніка барацьбы за рэкордны ўраджай. Пасля гэтага склікаецца нарада перадавікоў па ўраджайнасці. На гэтай нарадзе будзе падагулен вопыт барацьбы за высокі ўраджай 1936 года і намечаны канкрэтныя мерапрыемствы на 1937 год.

П. ЧЫКУН.

„КАЛГАСНІК ТАЛАЧЫНШЧЫНЫ" НЕДАЦЭНЬВАЕ ВАЖНАСЦІ ПЕРАПІСУ НАСЕЛЬНІЦТВА

Усесаюзны перапіс насельніцтва, які будзе праведзен 6 студзеня 1937 г., з'яўляецца важнейшым мерапрыемствам партыі і ўрада. Дакладнымі лічбамі ён наглядна прадэманструе сусветна-гістарычныя перамогі совецкага народу, атрыманыя пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі на чале з геніяльным правадыром таварышам Сталіным, па будаўніцтву соцыялізма ў нашай краіне і запісаныя ў Сталінскай Канстытуцыі.

Большавіцкі друк павінен і ў гэтым пытанні адыграць важную ролю.

Раённыя газеты на сваіх старонках павінны растлумачыць насельніцтву для чаго праводзіцца перапіс, як і калі ён будзе праходзіць. Яны павінны змагацца за паспяховую падрыхтоўку да гэтага важнейшага мерапрыемства.

«Калгаснік Талачыншчыны» гэтай справай фактычна не займаецца. Газета абмежавалася змяшчэннем аднаго і то блытанага артыкула. У ім не сказана ні слова аб становішчы падбору кадраў шчотчыкаў і кантралёраў-інструктароў па раёну, хоць у раёне нарушана пастанова СНК СССР аб зацверджанні перапісных кадраў да 1 лістапада.

Патрабавалася спецыяльнае ўмяшанне ЦВК БССР, каб у Талачынскім раёне заняліся гэтай справай. Але раённая газета не падняла пытання аб перапісу. Яна за ўвесь час не змясціла ні адной інфармацыі аб ходзе падрыхтоўкі да перапісу па раёну.

Праўда, у маленькай заметцы газета амаль у выглядзе аб'явы на апошняй калонцы паведаміла, што з 1 студзеня па Талачынскаму раёну пачнецца перапіс насельніцтва. Бачыце, па ўсяму Совецкаму Саюзу перапіс насельніцтва будзе праведзен 6 студзеня 1937 года, а ў Талачынскім раёне пачнуць перапіс насельніцтва з 1 студзеня і будуць перапісваць невядома да якога часу.

Не так трэба асвятляць раённай газеце важнейшае мерапрыемства партыі і ўрада.

Перапіс насельніцтва 1937 года праводзіцца па ініцыятыве таварыша **Сталіна** і ён павінен быць праведзен па-сталінску.

Аб павышэнні кваліфікацыі настаўнікаў

(Пісьмо дырэктара школы)

Павышэнне кваліфікацыі настаўнікаў— справа дзяржаўнай важнасці. Аднак органы народнай асветы гэты ўчастак работы зусім забываюць. А нельга яшчэ сказаць, што работа ў нашых школах адпавядае ўсім патрабаванням, якія да яе прад'яўляе партыя і совецкая ўлада.

Адной з галоўных заган у справе народнай асветы з'яўляецца нізкая адукацыя настаўнікаў. Правядзенне атэстацыі паказвае, што многія настаўнікі не маюць адпаведнай асветы. Так, з 119 атэставаных настаўнікаў нашага Лельчыцкага раёна дана званне настаўніка пачатковай школы толькі 35 чалавекам.

Многія органы народнай асветы нічога яшчэ канкрэтнага, апрача пустых рэзалюцый і пастаноў, не зрабілі ў галіне павышэння адукацыі настаўнікаў. У радзе школ настаўнікі перагружаны навучальнай і грамадскай работай. Вось, настаўнікі старэйшых класаў у нашай школе маюць па 40 навучальных гадзін у тыдзень. Ясна, што пры такой перагрузцы, часу для сур'ёзнай работы над сабою настаўнік не мае.

Педінстытуты і тэхнікумы, якім даручана важнейшая справа — асвета настаўнікаў, не надаюць дастатковай увагі гэтай справе. Заданні завочнікам прысылаюцца позна. Кансультацыі не праводзяцца. Выкананне сваёй справы педагагічныя інстытуты і тэхнікумы бачаць у адсылцы завочніку заданняў. Аб забеспячэнні завочніка літаратурай ніхто не клапоціцца. У вышэйшым педінстытуце (Менск) навучаецца завочна каля тысячы настаўнікаў. Інстытут мае нямала падручнікаў, прызначаных для завочнікаў. Аднак, завочнік карыстаецца імі толькі ў час летняй залікавай сесіі.

Неабходна пакласці канец такой практыцы навучання настаўнікаў.

Дырэктар Шугалейскай украінскай НСШ М. ЛАЎНІКОВІЧ.

Міхаіл КАЛЬЦОЎ

МУЖНАСЦЬ

Нікалай Остроўскі ляжыць на спіне, нерухома, абсалютна нерухома. Коўдра абгорнута вакол доўгага, тонкага, простага слупа яго цела, як пастаянны, не здымаемы футурал. Мумія.

Але ў мумі штосьці жыве. Так: Тонкія кісці рук — толькі кісці — ледзь-ледзь кратаюцца. Яны вільготныя пры поціску. У адной з іх слаба трымаецца цёгкая палачка з хустачкай на канцы. Слабым рухам пальцы накіроўваюць палачку да твару, хустачка адганяе мух, якія дзёрзка паўзбіраліся на ўступах беднага твару.

Жыве і твар. Пакуты падсушылі яго рысы, сцёрлі фарбы, завастрылі вуглы. Але губы расчынены, два рады маладых зубоў робяць твар прыгожым. Гэтыя вусны гаворыць, гэты голас спакойны, хоць і ціхі, ён толькі вельмі рэдка дрыжыць ад стомы.

— Вядома, пагроза вайны на Далёкім Усходзе вельмі вялікая. Калі мы прададзім Усходне-Кітайскую, вядома, на граніцы стане крыху спакайней. Але наогул-жа— хіба яны не разумеюць, што спазніліся заваяваць з намі? Мы-ж дужыя і мацнеем усё больш. Наша магутнасць накапляецца і прыбывае літаральна з кожным днём. Вось гэтымі днямі мне прачыталі з «Праўды»...

Тут мы робім новае страшэннае выпаходства. Не ўся, не, не ўся галава гэтага чалавека жыве! Два вялікіх вокі сваім цмяным, шкляністым бляскам не адказваюць на сонечны прамень, на твар субяседніка, на радок у газеце. Да ўсяго— чалавек яшчэ сляпы.

— Большасць прамоў пісьменніцкага з'езда я чуў па радыё. Але павінен сказаць—шмат чаго ў прамовах нехапала. Мала, па-моему, адлюстравана была тэма абароны. І па дакладах Стаўскага аб рабоце з маладымі я чакаў больш выступленняў. Нам хацелася-б атрымаць ад больш умелых таварышоў іх вопыт: як праходзіць па жыцці, як знаходзіць цікавае, каштоўнае, якімі вачыма гэта ўсё назіраць...

Ён гаворыць паволі, сур'ёзна, следуючы ходу сваёй думкі, будзённым тонам чалавека, які ненадта ўяўляе аб сабе, але далёкі і ад пачуцця якой-небудзь адцураемасці, няпоўнакаштоўнасці, няроўнасці з іншымі людзьмі. Калі зараз ускочыць і, хвалюючыся, сказаць, што вось ён сам, Нікалай Остроўскі, ёсць цікавейшы сюжэт, што аб ім даўно павінны былі-б напісаць вопытныя літаратурныя майстры, які павінны былі даўно заўважыць праслаўлена пільныя пісьменніцкія вочы, — такі парыў паказаўся-б тут, у пакойчыку, не да месца, несур'ёзным, які стаіць ніжэй спакойнага, дзелавога ўзроўню нашай гутаркі.

Наша краіна любіць герояў, бо гэта гераічная краіна. Ахвотна і шумна мы ўшаноўваем сваіх герояў, старых і новых, балазе яны не ўбываюць. Што ні дзень, моцныя і вясёлыя, ствараюць совецкія людзі цуды адвагі і сілы на ільдзінах, у прадзірыстых тоўшчах стратасферы, на шахматных палях, на парашутных парасонніках, на бегавых дарожках, у лыжных пераходах. Мы і радуемся гэтым малайцам, разглядаем іх на ўрачыстых сходах, на старонках журнала, на экранах кіно — іх бронзавыя плечы, пераможныя ўсмешкі, чуем іх звонкія галасы.

Не ўсіх герояў мы ведаем. І не ўсіх мы можам прыкмячаць.

Коля Остроўскі, рабочы хлапчук, мыў пасудзіну ў станцыйным буфеце. Першыя гады рэволюцыі на Украіне. Гаспадыня і афіцыянты выхоўвалі яго штуршкамі нагі. Але хутка хлапец знайшоў сабе іншых выхавальнікаў. У крывавай мешаніне петлюраўшчыны, германскай і польскай інтэрвенцыі быстраногі хлапчук аказаўся спрытным і смелым памочнікам рэволюцыйных рабочых. Хаваў зброю, насіў пісулькі, шнырыў пад носам у праціўніка, прыносячы сваёй разведкай вялікую карысць чырвоным партызанам. Потым пайшоў у конную армію і ў комасмол, у перадавыя, у лепшыя рады украінскага комасмола, таго, што сваёй маладой, гарачай крывёю шчодра афяраваў для вызвалення радзімы.

У сядле змагаўся Коля Остроўскі ля Кіева, ля Жытаміра, ля Новаград-Валынска. Пад Львовам у кавалерыйскай пагоні за праціўнікам, які адступае, перад вачыма яго «успыхнула магніем зялёнае полымя, перуном ударыла ў вушы, прыпяклo гартаваным жалезам галаву. Страшна, незразумела закружылася зямля і стала паварачвацца, перакідаючыся на бок. Пералятаючы праз галаву Гнедка, цяжка выляўся аб зямлю...»

Комсамольца вылячылі, паставілі на ногі, пусцілі ў жыццё, у работу. Вось ён у Кіеве, у губкоме. Збірае хлеб, вае з бандытамі, загатаўляе дровы, аднаўляе чыгунку. Брушны тыф валіць з ног, але зноў ён з парога смерці ўрываецца ў жыццё і зноў працуе ўжо прапагандыстам, арганізатарам, кіраўніком разрослых комсамольскіх легіёнаў. Над сталом вырасла паліца з кнігамі — Маркс уперамежку з Горкім і Джэкам Лонданам. У цэху змагаецца з прагуламі, у ячэйцы — з апазіцыяй, у прыгараднай сталбадзе—з хуліганамі. І ўсюды адольвае, і ўсюды перамагае, і ўсюды ірвецца наперад, малады, імпэтны, неўсміральны. Вось ён ужо сакратар акруткома комсамола, вось у Маскве, на Усесаюзным з'ездзе...

І раптам супроць Колі Остроўскага выступае новы ільдзяны страшэнны вораг. Усе папярэднія небяспекі ў параўнанні з гэтай здаюцца дзіцячай забавай.

Раненне пад Львовам, даўно ўжо забытае, раптам нагадвае аб сабе злавеснымі і таямнічымі сімптомамі. Відаць, тыф падштурхнуў гэты працэс. Упадак сіл, слабасць.

Коля атрымлівае доўгі адпачынак. Крым. Санаторый. Напружаныя галаўныя болі. Нервознасць. Урачы з цяжкасцю разбіраюцца ў хваробе. Усё-ж такі, калі скончыўся тэрмін пуцёўкі, комсамолец вяртаецца ў Харкаў і просіць новага прызначэння.

Ён зноў сакратар комсамола вялікага прамысловага раёна. Першая прамова на гаралскім актыве, потым раптам аварыя з аўтамабілем, расціснута калена правай нагі, аперацыя. Зноў адпачынак.

Ён піша брату:

«Ты не праў, што так упарта адмаўляешся ісці з вытворчасці на работу старшыні горсовета. Ты ваяваў за ўладу? Дык бяры-ж яе.

Заўтра-ж бяры горсовет і пачынай справу.

Цяпер аб сабе. У мяне робіцца нешта нядобрае. Я стаў часта бываць у шпіталях, мяне два разы парэзалі, пралітра нямала крыві, страчана нямала сіл, а ніхто яшчэ мне не адказаў, калі гэтаму будзе канец... Няма для мяне ў жыцці нічога больш страшэннага, як выйсці са строю. Аб гэтым нават не магу і падумаць. Вось чаму я іду на ўсё, але палянішэння няма, а хмары ўсё больш згушчаюцца. Пасля першай аперацыі, як толькі стаў хадзіць, вярнуўся на работу, але мяне ў хуткім часе прывезлі зноў. Зараз атрымаў білет у санаторый «Майнак» у Еўпаторыю. Заўтра выязджаю. Не сумуй, Арцём, мяне-ж цяжка ўгробіць. Жыцця ў мяне даволі, хопіць на траіх. Мы яшчэ папрацуем, братка. Бержы здароўе, не хватай па дзесяці пудоў. Партыі потым дорага абыходзіцца рамонт. Гады даюць нам вопыт, вучоба — веды, і ўсё гэта не для таго, каб гасніць па лазаретах».

Але іменна тое самае страшэннае, чаго-б баяўся Коля Остроўскі, чакае яго. Ён падслухоўвае рэцэпт прафесара аб сваім лёсе:

— Гэтага маладога чалавека чакае трагедыя нерухомасці, і мы бяссільныя яе прадухіліць.

Пачынае адымацца адна нага, потым другая, потым рука да кісці... Гэта ў дваццаць чатыры гады, калі жыццё п'яніць усімі кветкамі і пахамі, калі поруч каханая і кахаючая жанчына.

Остроўскі б'ецца, ён хоча вырвацца з дзеравяных абдымак параліча. Не згодзен прымірыцца з інваліднай кніжкай. Просіць якой-небудзь работы, якая не патрабуе руху. Можа, рэдакцыйнай, літаратурнай. Няма, у рэдакцыі адмаўляюцца ад яго. Малакультурны, піша з памылкамі.

Нарэшце наступае самая страшэннае. Тухне вока, спачатку адно, потым другое. Наступае вечная ноч.

Самы кароткі шлях збаўлення захаван у шуфлядзе начнога століка. Остроўскі доўга трымае ў руках халодную сталь рэвальвера... Не, усё-ж такі ён не трус, а баец.

«Шлёпнуць сябе кожны дурань зможа заўсёды і ва ўсякі час. Гэта самы трусліві і лёгкі выхад са становішча. Цяжка жыць — шлёпайся! А ты прабаваў гэта жыццё перамагчы? Ты ўсё зрабіў, каб вырвацца з жалезнага кола? А ты забыў, як пад Новаград-Валынскам семнаццаць разоў у дзень у атаку хадзілі і ўзялі-такі насупярэч усяму? Схавай рэвальвер і нікому ніколі аб гэтым не расказвай! Умей жыць і тады, калі жыццё становіцца невыносным. Зрабі яго карысным».

Ён робіць апошнюю штурмовую спробу выратаваць сваё цела. У Маскве робіць складанейшую, бясконца доўгую аперацыю, скрамсаўшы ўвесь хрыбет, скалупаўшы шыю, выразаўшы парашчытавідную залозу. Нічога не вышла.

І тады, сабраўшы на ўпалеўшых жывых кавалачках запасы жыццёвай цеплыні, нервовай энергіі, мужнасці, ён пачынае новы доўгі паход, заваяванне месца ў радах будаўнікоў соцыялізма.

Сябры-комсамольцы абсталявалі яму радыёнаўшнікі. Зрабілі дошчачку для пісання ўсляпую. Чыталі яму голасна. Коля Остроўскі ўзяўся за літаратуру. Ён надумаў стаць пісьменнікам. Рашыў памагчыся гэтага.

Не ўсміхайцеся спачувальна. Гэта дарэмна. Пачытайце лепш далей. Остроўскі вывучыў граматыку. Потым мастацкую класічную літаратуру. Закончыў і здаў работы па першаму курсу завочнага комуністычнага універсітэта. А пасля пачаў пісаць кнігу. Аповесць пра дывізію Катоўскага.

У працэсе работы завучваў напамяць слова ў слова, каб не згубіць ніці. Часам кі, часам нават раздзелы, і мацеры, проста старэйшы старшыны, здавалася, што сын яшчэ і звар'яцеў.

Напісаў. Даслаў на водгук старым катоўцам. Пошта падсабіла паралізаванаму аўтару, чым магла, — яна бясследна згубіла рукапіс. Коля Остроўскі на нявопрапала дарэмна.

І што-ж, Остроўскі пачынае ўсё спачатку. Задумвае новую кнігу, на новую тэму. Задумвае — і робіць. Раман «Як гартавалася сталь». У двух тамах.

Даслаў сваю рэч у выдавецтва. Не абіваў парогаў, не трызоніў у тэлефон. Не мітусіўся з пратэкцыямі. Сама яго кніга, прыпоўшы на рэдакцыйны стол, апаліла сваёй — вы думаеце, надрыўнасцю, смуткам? — не, маладосцю, задорам, свежай сілай.

Без усякіх пратэкцый кнігу выпусцілі. І зноў—не варажылі ёй бібліяграфічныя бабулі, не білі рэкламныя літары ў «Літературной газете», а чытач за кнігу схапіўся, запатрабаваў яе. Зараз яна ціха, скромна ўжо вышла другім выданнем, у 30 тысячах экземпляраў, і ўжо разышлася, і ўжо рыхтуецца трэцяе выданне.

Бойкія маладыя чалавекі, нарыфмаваўшы як мага хітрэй пару старонак у тоўстым журнале, сарваўшы воплескі на адказнай вечарынцы, ужо ірвуць тоўстыя авансы, ужо блукаюць важным кандыбоберам па пісьменніцкіх рэстаранах, ужо фіялетавыя кругі пудраць пад вачыма і хуліганяць на плошчах у чаканні помнікаў... Маленькі, збялелы Остроўскі, які наўзнік ляжыць у далёкай хатцы ў Сочы, сляпы, нерухомы, забыты, смела ўвайшоў у літаратуру, адсунуў больш слабых аўтараў, заваяваў сам сабе месца ў кніжнай вітрыне, на бібліятэчнай паліцы. Хіба-ж ён не чалавек вялікага таленту і бязмежнай мужнасці? Хіба ён не герой, не адзін з тых, кім можа ганарыцца наша краіна?

І галоўнае — што жывіла гэту мужную натуру? Што і зараз падтрымлівае духоўныя, фізічныя сілы гэтага чалавека? Толькі бязмежная любоў да калектыву будоўлі. Толькі жаданне быць ёй карысным. Остроўскі-ж пры ўсіх выпадках аставаўся-б матэрыяльна забяспечаны. Яму не пагражала-б жабрацтва, як інваліду капіталістычнага ладу. У яго ёсць персанальная пенсія, блізкія людзі — ляжаць бы, не стамляцца, захоўваць апраўданую бяздзейнасць. Але такое вялікае абаянне барацьбы, такая неперамагальная перакананасць агульнай дружнай работы, што сляпыя, паралічныя, невылечваемыя хворыя байцы спадарожнічаюць паходу і гераічна ірвуцца ў першыя рады.

Пераклаў Р. КАЗАК.
(«Правда», 17 сакавіка 1935 г.).

ПРАЦОЎНЫЯ БССР ВЫВУЧАЮЦЬ СТАЛІНСКУЮ КАНСТЫТУЦЫЮ

ПРЫЛІЎ У КАЛГАСЫ

Актыўна праходзіў агульны сход калгаснікаў арцелі «Большэвік», Слабадскога сельсовета, Магілеўскага раёна. На сход прышлі аднаасобнікі. З вялікім узлымам калгаснікі і аднаасобнікі вывучалі новую Канстытуцыю і даклад правадыра народаў таварыша **Сталіна** на З'ездзе Саветаў.

Калі прачыталі 9 артыкул Канстытуцыі аб тым, што: «Побач з сацыялістычнай сістэмай гаспадаркі, якая з'яўляецца пануючай формай гаспадаркі ў СССР, дапускаецца законам дробная, прыватная гаспадарка аднаасобных сялян і самастойнікаў, якая заснавана на асабістай працы і выключае эксплуатацыю чужой працы», — выступіў аднаасобнік Канаплёў.

— У адказ на новую Сталінскую Канстытуцыю, — пачаў Канаплёў, — я ўступаю ў калгас. Дзякуй роднаму бацьку таварышу Сталіну за Канстытуцыю, якая ясна і пераканаўча паказала шлях новага жыцця. Калгас — адзіны спосаб паляпшэння нашага жыцця, росту нашай заможнасці. Я вельмі шкадую, што раней не ўступаў у калгас. Цяпер ў калгасе быў-бы ўжо заможным. Але хай мне за гэта не папракаюць таварышы калгаснікі. Я абавязуюся працаваць у калгасе добрасумленна.

Як паведаміў нашаму работніку па тэлефону старшыня магілеўскага РВК тав. Слаўнік, у раёне вывучэнне Сталінскай Канстытуцыі і даклада таварыша **Сталіна** ўзняло хвалю небывалага ўздыму сярод усіх аднаасобных гаспадарак. У тым жа Слабодскім сельсавеце ў калгас імя Дзімітрава ўступілі 4 аднаасобныя гаспадаркі. У калгасы Балыкаўскага сельсавета падалі заявы 8 аднаасобнікаў. Усе нанова ўступіўшыя дзякуюць правадыру народаў таварышу Сталіну за новае, светлае жыццё, якое навечна запісана ў новай Канстытуцыі сацыялістычнага грамадства.

Усюды, дзе адбываюцца сходы калгаснікаў, прысвечаныя вывучэнню Канстытуцыі, прысутнічае многа аднаасобнікаў. У гэтыя дні яны адчулі вялікую сувязь з калгасам.—У Плешчаніцкім раёне, — паведаміў намеснік старшыні РВК тав. Харлап, — на ўсе сходы калгаснікаў прыходзяць аднаасобнікі і разам з імі вывучаюць Канстытуцыю. Тут-жа на сходзе яны падаюць заявы аб прыёме іх у калгас. За апошнюю дэкаду ўлілося ў калгасы больш 40 аднаасобнікаў. Прыліў з кожным днём пашыраецца.

У Заслаўскім раёне ва ўсіх населеных пунктах праведзены сходы аднаасобнікаў. Вывучаць новую Канстытуцыю прыходзяць усе члены сям'і — ад малога да старога. У Шаршунскім сельсавеце аднаасобнікі збіраліся ўжо два вечары і доўга за поўнач вывучалі Канстытуцыю і даклад таварыша Сталіна. 12 аднаасобных гаспадарак гэтымі днямі ўступілі ў калгасы раёна.

Сталінская Канстытуцыя ўзняла сярод шырокіх мас працоўных аднаасобнікаў новы небывалы ўздым і актыўнасць. Трэба яго падхапіць і арганізаваць штодзённы, масавы прыліў усіх працоўных аднаасобнікаў у калгасы.

СТАХАНАЎКІ ІЛЬНОАПРАЦОЎКІ

СТАРОБІН. У адказ на гістарычны даклад правадыра народаў таварыша Сталіна, калгасніца сельгасарцелі «13-годдзе Кастрычніка» Шклярэвіч Агапа дае рэкордныя паказальнікі на апрацоўцы ільну. Ручным спосабам яна штодзенна натроўвае за змену 30—35 кілограмаў ільновалакна замест нормы 5 кілограмаў, што складае 700 процантаў.

На другі дзень пасля вывучэння даклада таварыша Сталіна тав. Шклярэвіч натрапала ручным спосабам 42 кілограмы 18 нумарам.

За гэты дзень Шклярэвіч зарабіла 99 працадзён, або 40 рублёў грашыма, 400 кілограмаў бульбы і 50 кілограмаў збожжа, не лічачы іншых прадуктаў, якія прыпадаюць на працадні калгаснікаў.

Прыклад Шклярэвіч падхапілі і іншыя калгасніцы гэтай арцелі — Эпштэйн Эстар, Царык Марыя, Таміла Люба, Царык Аксіня, якія натроўваюць па 37 кілограмаў ільновалакна за змену.

Усяго на апрацоўцы ільну ў калгасе працуюць 40 жанчын, з іх 16 — стахановкі.

АЛ. ГЕРАСІМОВІЧ.

СЛОВА 103-ГАДОВАГА УЛЬЯНЫ ШЭМЕТ

УЗДА. Скончыўся працоўны дзень. Вярнуліся з работы калгаснікі, калгасніцы. Апрануўшыся па-святочнаму, яны спяшаліся на сход. Хата брыгадзіра Фросі Крыловіч перапоўнена людзьмі. Сюды прышлі старыя і моладзь паслухаць новы закон шчаслівага жыцця совецкага народу.

Пры выключнай увазе прысутных ад радка да радка зачытваецца Сталінская Канстытуцыя. Час-ад-часу чытка перарываецца ажыўленай гутаркай, выказваннямі пачуцця радасці і гонару за сацыялістычную радзіму, за сваё шчаслівае жыццё.

«Грамадзяне СССР маюць права на адпачынак», — гаворыцца ў 121 артыкуле Канстытуцыі. Гэта палажэнне ярка ілюструе прыкладамі з асабістага жыцця калгасніца Лісковіч Алена.

— Дзеці мае, — заяўляе яна, — дзякуючы совецкай уладзе вышлі ў людзі. Сын Сцяпан працуе інжынерам, Нікалай — у Чырвонай Арміі камандзірам, а дачка Соня вучыцца ў інстытуце на доктара. І гэта кожнаму даступна, кожнаму працоўнаму.

Калі дайшлі да 135 пункта Канстытуцыі, дзе гаворыцца аб усеагульным выбарчым праве, слова папрасіла Кандратовіч Маня.

Не знаходжу слоў, каб выказаць падзяку дарагому Сталіну за новую Канстытуцыю. Я — жонка былога кулака, была пазбаўлена выбарчых правоў, а зараз гэтыя правы прадастаўляюцца і мне, я стаю паўнапраўнай грамадзянкай Совецкага Саюза. Я прашу агульны сход прыняць мяне ў калгас і абяцаю сваёй чэснай работай апраўдаць ганаровае імя грамадзянкі СССР.

Да вялікага здзіўлення ўсіх прысутных, ўпершыню на калгасны сход прышла, апіраючыся на кіёк, Ульяна Шэмет. Гэтай бабульцы ўжо 103 гады. У глыбокіх маршчынах яе твара як-бы захавалася ўсё мінулае, цяжкае, пакутнае жыццё. Роўна 80 гадоў яна аддавала свае сілы на пана Жыдовіча і кулака Юрэвіча.

— Шчаслівыя вы, дзеткі мае родныя, пры новых парадках, — адкашляўшыся сказала бабуля Ульяна. І пачала апавядаць сумную гісторыю сялянскага жыцця часоў прыгонніцтва.

— Зайздрошчу вам, даражэнькія, і шкадую, — закончыла Ульяна, — ах, як шкадую, што я ўжо старая.

Я. ІВАШЫН.

Калгас «2-я пяцігодка», Уздзенскага раёна.

СТАЛІНСКАЯ КАНСТЫТУЦЫЯ

СПРАВАЗДАЧА ПАЭТА А. АЛЕКСАНДРОВІЧА— ДЭЛЕГАТА VIII З'ЕЗДА СОВЕТАЎ САЮЗА ССР

на сходзе байцоў і камандзіраў часці НКУС

У клубе часці НКУС незвычайны сход. Байцы, камандзіры і іх сем'і прышлі паслухаць справаздачу дэлегата Надзвычайнага VIII Усесаюзнага З'езда Саветаў СССР, члена Рэдакцыйнай Камісіі З'езда паэта тав. А. Александровіча.

— Мне, — гаворыць тав. Александровіч, — цяжка перадаць усе тыя пачуцці, якія перажывалі ўсе мы, слухаючы даклад Вялікага Сталіна. Няма слоў, каб перадаць усе ўражанні аб З'ездзе. Словы гэтыя, магчыма, яшчэ не створаны...

Шквал захаплення напаўняў залу ўвесь час даклада таварыша Сталіна. Даклад правадыра здзіўляе сваёй глыбінёю. Аналіз велізарнаму гістарычнаму перыяду заваяванняў і перамог таварыш Сталін даў у яснай і абагульваючай форме. «Вялікае ў простым і простае ў вялікім». Поўная перамога сацыялізма. Узорамі рускай класічнай літаратуры таварыш Сталін знішчальна высмейваў буржуазных «гора-крытыкаў» праекта нашай Канстытуцыі. Чырванелі, як буракі, дыпламаты буржуазных краін, якія адчувалі падобнасць сваіх пісак-крытыкаў з самадурам з казак Шчэдрына.

Чоткасць, прастата, яснасць, празорлівасць — паказваюць сілу і веліч нашага дарагога правадыра.

***

Па дакладу тав. Александровіча выказалася 11 чалавек. Капітан т. Якунскі падзяліўся той велізарнай радасцю, з якой яго часць сустрэла даклад таварыша Сталіна і прыняцце новай Канстытуцыі. Тав. Якунскі гаворыць аб Беларусі раней прыгнечанай, але якая на аснове ленінска-сталінскай нацпалітыкі развіваецца, квітнее, выйшла ў рады перадавых рэспублік Саюза і атрымала вышэйшую ўзнагароду — ордэн Леніна.

Сталінская Канстытуцыя забяспечвае яшчэ большы росквіт усёй нашай вялікай радзіме.

Палкоўнік тав. Арцем'еў у сваім выступленні расказаў аб праклятым мінулым.

— Адчуць «правы» рабочых дарэвалюцыйнай Расіі, — гаворыць ён, — прышлося і мне. Працуючы на ленінградскіх заводах, мы мелі «права» — быць бітымі, працаваць па 16 гадзін, жыць у цёмных канурах. А ва ўзросце 21 года нас цягнулі ў царскую казарму і там пры дапамозе кулакоў убівалі ў галаву аб абароне веры, у якую мы не верылі, аб абароне бацькаўшчыны, якой у рабочых тады не было, аб абароне цара, якога з усёй буржуазнай зграяй мы імкнуліся ўтапіць у Неве.

Гаворачы аб падрыхтоўцы фашыстамі вайны, тав. Арцем'еў кажа:

— Нам не страшны ворагі. Мы маем ўсё неабходнае, каб яго знішчыць. Нашы байцы самыя культурныя, а нашы камандзіры самыя падрыхтаваныя ў свеце. Нам ёсць што абараняць і так будзем абараняць, як ніхто і ніколі не абараняў. **(Апладысменты).**

На трыбуне малады баец-выдатнік тав. Валовіч.

— Мой бацька, гаворыць ён, — быў батраком. У цяжкіх умовах жыла сям'я. А што мы маем зараз? Старшы брат — інжынер, другі—камандзір РСЧА, трэці—вучыцца. Сям'я дзевяты год у калгасе. Жыве заможна. Таварыш Сталін — вось хто даў нам усё гэта.

Сталінская Канстытуцыя натхняе нас яшчэ лепш вучыцца. Мы заўсёды гатовы абараняць нашу социялістычную радзіму.

Баец тав. Лебедзеў заявіў:

— Мы запэўняем вялікага правадыра таварыша Сталіна, што ў нас не дрогне рука, не здрадзіць вока ў барацьбе з ворагамі, якія рыхтуюць супроць нас вайну.

Выступіў самы старэйшы чалавек у нашай часці, упершыню на такім многалюдным сходзе, тав. Сазонаў. Ён гаварыў аб жудасным мінулым і радасным сучасным.

Жонка камандзіра тав. Шабурова выказала свае пачуцці любві да Вялікага Сталіна:

— Мы бачым, — гаворыць яна,—наколькі вялікія яго клопаты аб жанчыне. У нас у краіне няма ўжо той жанчыны, аб якой пісаў паэт Некрасаў:

«Долюшка русская,
Долюшка женская,
Вряд-ли труднее сыскать»,

бо наша жанчына самая шчаслівая ў свеце.

У сваіх выступленнях тт. Юханаў, Мясніковў, Дзяменцьеў і Манойленка віталі Сталінскую Канстытуцыю, правадыра народаў таварыша Сталіна і ад імя байцоў запэўнялі аб пастаяннай гатоўнасці абараняць граніцы социялістычнай радзімы, знішчаць ворага, адкуль-бы ён ні з'явіўся.

С. К. ТРЫФОНАЎ.

23 снежня менская музычная школа адзначае свой 10-гадовы юбілей. НА ЗДЫМКУ (злева направа) першы рад: старэйшыя педагогі школы, якія працуюць у ёй з дня заснавання, — Е. Д. Цір, Ю. Г. Жарсавіцкі, Э. І. Сульская. У другім радзе педагогі, былыя вучні школы: З. О. Гімбург, Д. В. Карасік і К. С. Кавалёнак. У трэцім радзе —маладыя таленавітыя вучні школы: Броня Махара, Фіма Дройкін і Роза Левіна.

Фота С. Грына і В. Лейна (БСФ).

ШКОЛА ВЫХАВАННЯ КОМУНІСТАЎ

«Член партыі,—гаварыў тав. Кагановіч на XVII з'ездзе,—абучаецца і павінен абучацца на партыйным сходзе не менш, калі не больш, чым у партыйнай школе».

Гэтыя ўказанні Лазара Майсеевіча Кагановіча, бліжэйшага саратніка вялікага стратэга рэволюцыі таварыша **Сталіна,** партком фабрыкі імя Куйбышэва (Менск) паклаў у аснову сваёй работы.

7 кастрычніка на агульнафабрычным партыйным сходзе абмяркоўвалі справаздачу сакратара парткома тав. Бруднера аб рабоце партыйнага камітэта за 1936 г.

Падрыхтоўка пачалася задоўга да партыйнага схода. За 12 дзён да партыйнага схода партком правёў нараду парторгаў, нараду партыйнага актыва, правялі гутаркі з комуністамі аб чарговым партыйным сходзе. Апрача нарад і гутарак для падрыхтоўкі партыйнага схода партком прыцягнуў больш 20 членаў партыі, якія правялі становішча асобных галін партыйнай работы і намячалі свае канкрэтныя прапановы.

Напрыклад, члены партыі тт. Кац і Каган правялі становішча партыйнай вучобы, тт. Гарэлік і Капілевіч—работу са спачуваючымі і беспартыйным актывам, тт. Гарохаў і Чэрнін правялі пастаноўку агітацыі на фабрыцы і т. д.

Па дакладу тав. Бруднера (аб рабоце парткома) у спрэчках выступіла 15 членаў і кандыдатаў партыі з 35 прысутнічаючых на сходзе.

Прыцягненне членаў партыі да ўдзелу ў падрыхтоўцы партыйных сходаў, разгортванне крытыкі і самакрытыкі садзейнічала росту актыўнасці комуністаў.

Так, тав. Цырлін у партыйным жыцці прымаў слабы ўдзел, на партыйных сходах рэдка выказваўся. Партыйны камітэт спачатку даваў тав. Цырліну невялікія партыйныя даручэнні па падрыхтоўцы да партыйных сходаў і інш. Цырлін уцягнуўся ў работу, пачаў выступаць на партыйных сходах, выказваць свае думкі і ўносіць свае прапановы. Зараз тав. Цырлін не толькі прымае актыўны ўдзел у рабоце фабрычнай партыйнай арганізацыі, але атрымлівае асобныя даручэнні ад райкома партыі, правярае становішча работы ў іншых партарганізацыях раёна.

Або член партыі тав. Чэрнін, які таксама вельмі рэдка выступаў на партыйных сходах. Зараз Чэрнін з'яўляецца агітатарам самага буйнага цэха фабрыкі і праводзіць гутаркі па міжнародных і ўнутраных пытаннях. Вырасла тав. Капілевіч і рад іншых таварышоў.

Зараз партарганізацыя разгарнула вялікую работу па падрыхтоўцы да партыйнага схода, які адбудзецца 27 снежня. На сходзе рыхтуюцца абмеркаваць пытанне аб палітагітацыі на фабрыцы па рашэннях Надзвычайнага VIII Усесаюзнага З'езда Саветаў, дакладу таварыша **Сталіна** і Сталінскай Канстытуцыі.

РОХКІН.

ПАРТЫЙНЫ СХОД ПА ПРЫЁМУ У ПАРТЫЮ

Цэнтральны Камітэт ВКП(б) устанавіў строга індывідуальны парадак прыёму ў партыю. «Кожны новаўступаючы ў партыю павінен прадставіць у партыйную арганізацыю асабіста ім напісаную заяву аб жаданні ўступіць у партыю, анкету па ўстаноўленай ЦК ВКП(б) форме, рэкамендацыі, згодна патрабаванняў статута ВКП(б), і водзывы тых арганізацый, дзе ўступаючы ў партыю працаваў ці працуе». ЦК ВКП(б) абавязаў пярвічныя партыйныя арганізацыі пры разглядзе заяў аб прыёме ў партыю на партыйных сходах «поўнасцю зачытваць анкету новаўступаючага ў члены ВКП(б) і ўсе прадстаўленыя ім рэкамендацыі».

Аднак, на партыйным сходзе пярвічнай арганізацыі галантарэйнай фабрыкі імя Фрунзе пры пераводзе з кандыдатаў у члены партыі тт. Гельштэйн і Хацэра гэтыя ўказанні ЦК ВКП(б) не былі захаваны.

Перад абмеркаваннем заяў Гельштэйн і Хацэра аб пераводзе іх з кандыдатаў у члены партыі сакратар парткома тав. Каравай напомніў сходу, што пасля чаты рохгадовага перапынку сёння ўпершыню на партыйным сходзе абмяркоўваецца пытанне аб прыёме ў партыю.

Тав. Каравай не палічыў патрэбным напомніць членам партыі аб строга індывідуальным падыходзе да прыёму ў партыю, як гэта патрабуе ЦК ВКП(б). Уступная яго прамова склала ўражанне, што партыйны камітэт доўга ўгаварваў тав. Гельштэйн і Хацэра ўступіць у партыю.

Ніхто з комуністаў, прысутнічаўшых на сходзе, не пацікавіўся біяграфічнымі данымі тав. Гельштэйн. А сакратар партыйнага камітэта не лічыў патрэбным прачытаць сходу ні анкету, ні рэкамендацыі, як гэта патрабуе ЦК ВКП(б). А ў анкеце запісана, што ў фашысткай Польшчы жывуць тры браты тав. Гельштэйн. Аб гэтым сход не ведаў. Пытанне аб тым ці мае Гельштэйн сувязь з імі і якую засталося нявысветленым. Не цікавіла гэта і тав. Гальбурта, які яе рэкамендаваў. Тав. Гальбурт пасля схода прызнаўся, што ён анкеты не чытаў.

Гальбурт, які рэкамендуе яе, заявіў, што ведае Гельштэйн з 1930 года.

«Яна актыўна змагаецца за паляпшэнне якасці выпускаемай прадукцыі. Дапамагла выкрыць прахадзімца Беленькага. Я лічу, што тав. Гельштэйн можа быць і будзе добрым членам партыі».

Прыблізна такімі былі і выступленні тав. Фрумкінай, Альшэўскага і Кулікавай. Усе яны адзначалі добрую работу тав. Гельштэйн і яе палітычны рост.

Пасля гэтага паставілі на галасаванне не прыём тав. Гельштэйн у члены ВКП(б), а толькі зацвярджэнне пастановы партыйнага камітэта. І сход пастанавіў: —зацвердзіць рашэнне партыйнага камітэта.

***

Такім-жа парадкам было абмеркавана пытанне аб пераводзе тав. Хацэра з кандыдатаў у члены ВКП(б). Тав. Каравай зачытаў заяву, аўтабіяграфію (анкету і рэкамендацыі не чытаў). Абвясціў, што рэкамендуюць тав. Хацэра ў члены партыі тт. Мурашка, Стацэвіч і Шушкет.

— Тав. Хацэр, — гаворыць тав. Каравай, — у 1933 годзе пры чыстцы партыі быў пераведзен з членаў у кандыдаты ВКП(б) за палітнепісьменнасць і нядбайныя адносіны да работы. Хацэр у апошні час стаў лепш працаваць. Вырас ён і палітычна, таму партыйны камітэт рашыў перавесці яго з кандыдатаў у члены ВКП(б).

Старшыня схода зварачаецца да комуністаў: — ці ёсць пытанні да тав. Хацэра?

Комуністы пачалі задаваць пытанні накшталт: «Што такое капіталізм у квадраце», «Што напісана ў кнізе контрэволюцыянера Троцкага «Уроки Октября», «Калі і якія апазіцыі былі ў партыі».

Тав. Хацэр пачаў адказваць на гэтыя пытанні, але яго не слухалі. Таму не дзіва, калі партыйны сход не звярнуў увагі на няправільны, па сутнасці шкодны адказ на пытанне аб барацьбе партыі з контрэволюцыйным трацкізмам.

Так несур'ёзна, павярхоўна падышлі ў пярвічнай партыйнай арганізацыі фабрыкі імя Фрунзе да такой вялікай і адказнай справы, як прыём у партыю.

Тав. Каравай—малады сакратар парткома, растучы таварыш. Ён вучыцца і жадае працаваць. Але здзіўляе бестурботнасць Варашылаўскага райкома партыі, які не паклапаціўся паслаць свайго прадстаўніка ў такую арганізацыю, якой неабходна дапамагчы.

Б. РОБЕРМАН.

ДЗЕСЯЦІГОДДЗЕ МЕНСКАЙ МУЗЫЧНАЙ ШКОЛЫ

Совецкі Саюз з'яўляецца краінай герояў і талентаў. Вялікая социялістычная Кастрычніцкая рэволюцыя пад вядзіцельствам геніяльных стратэгаў **Леніна** і **Сталіна** назаўсёды скінула ярмо капіталістаў і памешчыкаў з шыі працоўных і адкрыла шырачэзныя прасторы для росту і росквіту талентаў, **«якіх у народзе непачатая крыніца і якія капіталізм мяў, давіў, душыў тысячамі і мільёнамі» (Ленін).**

Партыя і асабіста любімы правадыр народаў вялікі **Сталін** сістэматычна і пабацькоўску клапоціцца аб будаўніках социялізма і іх дзецях. У нашай социялістычнай краіне створаны найлепшыя ўмовы для радаснага жыцця і вучобы шчаслівай падрастаючай дзетвары. Прыгожыя, светлыя сталінскія школы, як агульнаадукацыйныя, так і музычныя, шырока раскрыты для дзяцей. Менская музычная школа з'яўляецца адной з такіх шматлікіх школ, пры гэтым самай старэйшай музычнай школай у ордэнаносным БССР. Зараз грамадскасць адзначае 10-годдзе яе існавання.

Штодзенна праводзячы ў жыццё ўказанні партыі і мудрага правадыра народаў таварыша Сталіна аб падрыхтоўцы новых кадраў, школа за пройдзены перыяд дабілася багатых дасягненняў у сваёй рабоце. Выхавана многа маладых педагогаў (Жлановіч, Карасік, Хургіна, Савіцкая, Левіна і інш.), якія зараз працуюць выкладчыкамі ў гэтай-жа школе. Першую музычную асвету атрымалі ў нашай школе піяністы і вакалісты Гітліц, Бергер, Грунч (апошняя зараз працуе загадчыкам навучальнай часткай бабруйскай музшколы), Млодак, Сямага, Гольдберг, маладыя кампазітары Кавалёў, Сендзярэй і інш. Школа не адзін дзесятак сваіх вучняў перадала ў вышэйшыя музычныя ўстановы—кансерваторыі. Усе гэтыя таварышы працуюць як у гарадах БССР, так і ў іншых брацкіх рэспубліках Саюза, паспяхова дапамагаючы працоўным нашай социялістычнай краіны культурна арганізоўваць свой, назаўсёды ўзаконены новай, Сталінскай Канстытуцыяй адпачынак.

У сучасны момант у менскай школе навучаецца 700 дзяцей рабочых і служачых па класах раяля, скрыпкі, віяланчэлі і народных інструментаў. Школа таксама мае свой філіял пры клубе металістаў для дзяцей рабочых-стахановцаў менскіх заводаў імя Кірава і Варашылава. У філіяле навучаецца 50 дзяцей.

Сярод гэтых 750 здольных падлеткаў ёсць многа юных дараванняў. Вучань па класу скрыпкі **Немзер** ужо мае некалькі сваіх музыкальных твораў, Адзін з яго твораў запісан на грамафонную пласцінку маскоўскай брыгадай, якая не так даўно працавала ў Менску па запісу песень народаў БССР. Таксама маюць пядрэнныя творчыя задаткі і такія нашы пачынаючыя юныя кампазітары, дзеці стахановцаў, як **П. Гурэвіч, Оля Ладыгіна, Глайхенгауз.** У нашай школе вучацца па класу скрыпкі, віяланчэлі і піяніна браты **Салодчанкі і Мая Сініцкая.** Усім ім разам лезь сабярэцца 19 год. Але яны ўжо іграюць лёгкія творы Бетховена, Моцарта, Шапэна, Шуберта. Багатыя надзеі падаюць па класу скрыпкі сын калгасніка з Рагачоўскага раёна **Яфім Сарокін,** сын ваеннаслужачага **Геня Рудамед,** сын калгасніка **Грыша Гольдберг** і інш. Спіс такіх прыкладаў можна было-б на многа пашырыць.

Жыццём і работай нашай школы сістэматычна цікавяцца і кіруюць партыйныя арганізацыі. Дзякуючы гэтаму мы змаглі школу забяспечыць высокакваліфікаванымі, вопытнымі выкладчыкамі, добра абсталяваць яе. У школе працуюць 44 педагогі, многія з якіх маюць досыць багаты стаж работы. Так, па струннаму аддзяленню працуе педагог з 52-гадовым стажам тав. **Жухавіцкі,** па класу віяланчэлі працуе з 35-гадовым стажам тав. **Фідлон.** У школе працуюць такія педагогі, як кампазітар **Цікоцкі,** скрыпач **Бяссмертны, Асрыеў, Цір, Сульская, Барадзіна, Садоўская** і інш. Усе яны, удасканальваючы яшчэ больш сваю практыку і веды шляхам чыткі метадычнай, музычнай, мастацкай і палітычнай літаратуры, маючы багаты вопыт настаўніцкай работы, любоўна развіваюць у дзяцей музыкальныя даныя, любоўна дапамагаюць ім авалодваць багацтвам социялістычнай музычнай культуры. Нашы педагогі таксама звяртаюць асаблівую ўвагу на вывучэнне народнай творчасці.

У распараджэнне школы прадастаўлена добрае памяшканне з 24 светлымі класамі. Школа іх прыгожа абсталявала, набыла бібліятэку з лікам 10 тысяч нот і кніг па музыцы, багаты асартымент музычных інструментаў: 25 раялей і піяніна, 200 скрыпак, 23 віяланчэлі, 50 розных народных інструментаў, поўны набор домравага аркестра і інш.

Адной з дадатных асаблівасцей менскай музыкальнай школы з'яўляюцца яе аркестровы і харавы калектывы. Школьны аркестр (кіраўнік т. Фідлон) налічвае 65 аркестрантаў і вылучаецца сваёй стройнай сыгранасцю, злажанасцю ансамбля. Аркестр паспяхова выконвае такія рэчы, як адрыўкі з сімфоніі Цікоцкага, беларускія п'есы Шчэглова, неапалітанскую песню Чайкоўскага, менуэт і 6 народных танцаў Моцарта.

Хор школы (кіраўнік т. Хургіна) з'яўляецца адным з лепшых у Менску, калі яго параўноўваць нават з хорамі дарослых. Дастаткова сказаць, што некалькі песень хора нашай школы запісаны на грамафонныя пласцінкі, што хор з поспехам удзельнічаў у афармленні пісьма беларускага народу вялікаму **Сталіну** і 20 лістапада з такім-жа поспехам выступаў у Беларускім дзяржаўным тэатры перад дэлегатамі Надзвычайнага XII Усебеларускага З'езда Саветаў.

Каштоўным з'яўляецца і тое, што пры школе працуе творчы гурток (кіраўнік кампазітар Цікоцкі). У гуртку займаюцца дзеці, якія праяўляюць творчыя здольнасці. Гэты гурток налічвае 16 такіх дзяцей.

Школа праводзіць вялікую культурна-выхаваўчую работу сярод сваіх вучняў. У гэтым нам многа дапамагаюць бацькі, з якімі школа трымае цесную сувязь. Мы таксама трымаем добрую сувязь з агульнаадукацыйнымі школамі, у якіх займаюцца нашы рэбяты. У выніку мы маем частыя выпадкі, калі ў нашу школу паладае той ці іншы вучань з надзвычай адмоўнымі адносінамі да дысцыпліны і вучобы, а праз некаторы час становіцца прыкладным і ў тым і ў другім. Апрача гэтага, дзякуючы такой пастаноўцы работы, мы дабіліся таго, што вучні нашай спецыяльнай музычнай школы маюць 96 проц. добрай паспяховасці ў вучобе.

Вось так выглядае менская музычная школа. А такія школы ёсць і ва многіх іншых гарадах БССР: у **Магілеве, Віцебску, Оршы, Бабруйску, Гомелі, Мозыры.** І ўсё гэта ў той краіне, якая царскім самадзяржаўем называлася «Северо-Западным краем» і зусім не ведала музычнай асветы. Існаваўшыя там-сям у гэтым «Краі» прыватныя музычныя школы былі даступны толькі дзецям дваранства і буйнай буржуазіі. Дзеці рабочых і працоўных сялян, у сваёй большасці не меўшыя магчымасці наведваць нават агульнаадукацыйныя школы, не маглі і марыць аб спецыяльнай музычнай асвеце, як не могуць марыць і зараз дзеці працоўных Польшчы і іншых капіталістычных краін.

Бацька вучня нашай школы (у сваім прывітанні да дзесяцігоддзя школы) стахановец менскай абутковай фабрыкі імя Кагановіча т. Мордух Сляпян піша: «Калі я, будучы яшчэ шаўцом у прыватніка, выказаў сваё палкае жаданне вучыцца музыцы, мяне палічылі псіхічна хворым. Гэта з'явілася прычынай бясконцых злосных нада мной. Любоў да музыкі прышлося глыбока захаваць».

А вось другое пісьмо, якое прыслаў у школу таксама ў сувязі з дзесяцігоддзем бацька вучня нашай школы стахановец т. Дрэслер. Прыводжу гэта пісьмо поўнасцю:

«У 12 год, працуючы пастушком у вёсцы, я ўжо з захапленнем граў на дудцы-самадзелцы. Цяжка цяпер мне прыпомніць якія мелодыі выконвала мая самадзелка, памятаю толькі, што яны былі сумныя, як тагочаснае маё жыццё. Але хутка давялося закінуць і дудку. Я быў старэйшым у сям'і. Трэба было пракарміць 8 чалавек. Пайшоў «у людзі». Працаваў у млыне, быў сталяром, токарам. З першага-ж заработку купіў сабе скрыпку, але і на ёй іграць не давялося: скрыпку абмяняў на хлеб. І толькі зараз, на 45 годзе свайго жыцця, я вярнуўся да музыкі і вось пры якіх акалічнасцях: тры гады таму назад прынялі ў менскую музычную школу майго 9-гадовага сына Артура. Далі ў школе Артуру маленькую скрыпку. Стаў Артур старанна займацца, а я стаў да яго прыслухоўвацца. Зноў у мяне з'явілася даўняя любоў да музыкі. Не вытрымаў я. Паступіў вучыцца ў музычную школу для дарослых. Пачаў спаборнічаць з сынам. Развучваем з ім дуэты. У чымнебудзь ён мне, а ў чым і я яму дапамагаю.

Зараз Артур на трэцім курсе, яму далі большую скрыпку, а маленькую, на якой займаўся Артур, школа не забрала і аддала яе майму другому сыну 9-гадоваму Леапольду: ён таксама мае добрыя музыкальныя здольнасці. Такім чынам хутка ў мяне сям'і, сям'і былога непісьменнага і цёмнага пастуха будзе музычнае трыо. Цяпер я скрыпкі не закіну і абавязкова буду іграць у сімфанічным аркестры.

Мне хочацца разам са сваімі дзецьмі ад усёй душы гучна крыкнуць:

— Дзякуй роднаму Сталіну за радасны, шчаслівае і культурнае жыццё!»

У нашай шчаслівай краіне радасць бацькоў і іх дзяцей не мае граніц. Выказваючы настроі нашай совецкай дзетвары, вучаніца пятага курса нашай школы выдатніца Блюма Салавейчык гаворыць:

— Мы з'яўляемся тымі, для каго нашы бацькі і старэйшыя браты пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна заваявалі правы на светлае і шчаслівае дзяцінства. Я хачу вельмі добра вучыцца, лепш за ўсіх танцаваць, спяваць, бегаць, радавацца, весяліцца!

Народны камісарыят асветы БССР абвясціў нашу школу ўзорнай. Гэта ўся школа ўсхрыняла, як вялікую ўвагу да нас і як ганаровы абавязак для кожнага педагога ў далейшай рабоце па выхаванню і падрыхтоўцы новых кадраў социялістычнага мастацтва. У далейшым наша школа аддасць усю ўвагу таму, каб яшчэ больш павысіць паспяховасць вучняў у вучобе, каб кожны наш вучань стаў дастойным патрыётам сваёй социялістычнай радзімы, каб яшчэ больш развіць у кожнага вучня любоў да партыі і да вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна, пад чыём кіраўніцтвам мы прышлі да такога светлага, шчаслівага і радаснага жыцця.

І. Г. ГЕРМАН,

дырэктар менскай узорнай музычнай школы.

БУДАЎНІЦТВА РАДЗІЛЬНЫХ ДАМОЎ І ЯСЛЕЙ

«Правда» ў нумары ад 21 снежня змясціла артыкул народнага камісара аховы здароўя Саюза ССР тав. Г. Камінскага аб ходзе будаўніцтва радзільных дамоў і яслей. Па праграме, зацверджанай урадам, у другой палове 1936 года ў СССР павінна быць пабудавана 1.555 дзіцячых яслей, 500 радзільных дамоў і звыш 150 малочных кухняў з кансультацыямі пры іх. Агульны кошт гэтых будынкаў перавышае 420 мільёнаў рублёў. Да 10 снежня план будаўніцтва выканан толькі на 50 проц. Пад дахам знаходзяцца не больш 1.440 аб'ектаў. Упераддзе ідуць Варонежская, Паўночная, Маскоўская, Данецкая і Днепрапетроўская вобласці і БССР. Дрэнна ідзе будаўніцтва яслей па прадпрыемствах лёгкай і харчовай прамысловасці.

—Неабходна,—піша тав. Камінскі, — закончыць у бліжэйшыя дэкады праграму будаўніцтва гэтага года, ні на мінуту не забываючы аб якасці работ. Кожны радзільны дом і ясці павінны сваімі ўнутранымі выгодамі і вабячым знадворным выглядам радаваць совецкую маці і дзяцей. Трэба таксама ўлічыць, што праграма бягучага года—толькі частка велізарнага плана пашырэння сеткі радзільных дамоў і дзіцячых устаноў. Таму трэба ўжо зараз паклапаціцца аб выбары пляновак, аб тыповых праектах і каштарысах, аб падрыхтоўцы будаўнічых кадраў.

АКАДЭМІКІ-НЕЗВАРОЧАНЦЫ

У «Правде» 21 снежня змешчан артыкул акадэміка В. Камарова. Тав. Камароў піша аб двух вядомых хіміках — акадэміках В. Н. Іпацьеве і А. Е. Чычыбабіне. Абодва — буйныя хімікі, вельмі каштоўныя вучоныя, якіх шкада траціць, і абодва аказаліся здраднікамі сваёй радзіме, сваёй краіне.

Чычыбабін, у якога здарылася асабістае няшчасце — смерць адзінай дачкі, паехаў у камандыроўку за граніцу і там паступіў на службу ў прыватную лабараторыю. Ён нават узяў работу па абароннай хіміі, што лёгка можа пайсці ў шкоду нашай краіне.

Малады хімік, які паехаў угаварыць акадэміка вярнуцца ў Совецкі Саюз, расказвае, што ніяк нельга вярнуць вучонага да актыўнага навуковага жыцця. У адказе Чычыбабіна Акадэміі навук рэзка праглядае крайні індывідуалізм вучонага.

Такую-ж антысовецкую пазіцыю заняў другі вучоны В. Н. Іпацьеў.

Уехаўшы ў кароткатэрміновую камандыроўку ў Заходнюю Еўропу, Іпацьеў апынуўся ў Амерыцы і паступіў там на службу да нафтавай фірмы. На просьбу Акадэміі вярнуцца і прыступіць да работы, Іпацьеў адказаў, што ён не можа скасаваць кантракт і выехаць з Амерыкі.

Абодва акадэмікі парушылі асноўныя пункты совецкай Канстытуцыі, пункты аб дысцыпліне працы і абароне радзімы. Застаўшыся за мяжой, паступіўшы на службу да ворагаў рабочага класа, яны тым самым здрадзілі свайму грамадскаму абавязку.

Няма сумнення, што совецкая навука і тэхніка абыйдуцца без вучоных-здраднікаў, якія лічаць за лепшае пачываць на лаўрах у Амерыцы, чым праяўляць сябе на карысць совецкай навукі.

РАСТЛУМАЧЭННЕ ВЦСПС

У сувязі з паступіўшымі запытаннямі з боку мясцовых прафесіянальных арганізацый, Усесаюзны Совет прафесіянальных саюзаў растлумачыў, што згодна пастановы СНК Саюза ССР ад 20 снежня 1935 года, выходны дзень з 30 снежня перанесен на 1 студзеня.

ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА ПОЛЬШЧЫ

Польскі міністр замежных спраў Бек выступіў з прамовай у камісіі польскага сената па замежных справах. У гэтай прамове ён падвёў вынікі знешняй палітыкі Польшчы за апошні год.

Тав. Я. Віктараў у «Правде» характарызуе асноўныя моманты прамовы кіраўніка знешняй палітыкі фашысцкай Польшчы.

Пазіцыя, занятая Бекам у адносінах вузлавых пытанняў міжнароднай палітыкі, не пакідае сумненняў у тым, што няма ніякіх змен у польскай знешняй палітыцы, што яна, як і раней, застаецца ў германскім фарватэры.

Не дзіва, што прамова Бека была спаткана ў Берліне з яўным задавальненнем. Бек палкрэсліў, што асновай польскай знешняй палітыкі з'яўляецца польска-германская дружба. Ён абыйшоў поўным маўчаннем пытанне аб польска-чэхаславацкіх адносінах і гэтым толькі падкрэсліў гутаркі аб гатоўнасці Польшчы садзейнічаць агрэсіўным планам германскага фашызма.

Імкнучыся ўслужыць Берліну, Бек выступіў з заявай, накіраванай супроць Лігі нацый. Гэта заява выяўляе імкненне, выказанае раней у мемарандуме Бека аб рэформе статута Лігі нацый, імкненне ператварыць Лігу ў зброю агрэсараў.

У адносінах падзей у Іспаніі польскі міністр замежных спраў падтрымаў інтэрвентаў. Ён гатоў дапамагаць ліквідацыі ўсякіх перашкод на шляху агрэсіўных замыслаў Германіі і Італіі.

У сваёй прамове Бек узяў на сябе ролю няпрошанага апекуна прыбалтыцкіх дзяржаў. Ён меў смеласць закрануць адносіны СССР з яго суседзямі, адносіны, якія зусім не датычаць Польшчы. Бек выканаў тут заказ Гебельса, які пусціў хлуслівую версію прамовы тав. Жданава на З'ездзе Совецкаў СССР.

Прамова кіраўніка польскай знешняй палітыкі яшчэ раз гаворыць аб тым, што не гледзячы на ўсе дыпламатычныя ўвёрткі і гутаркі аб нейтралітэце Польшча прымыкае да блока агрэсіўных дзяржаў, узначальваемых фашысцкай Германіяй.

АШУКАНАЯ ДРОБНАЯ БУРЖУАЗІЯ

У газеце «За индустриализацию» змешчана пісьмо з Берліна пад загалоўкам «Ашуканая дробная буржуазія». Аўтар пісьма В. Лаўноў расказвае аб настроях дробнай буржуазіі Германіі. Гэтыя настроі з'яўляюцца найбольш цікавым барометрам унутранага становішча «Трэцяй імперыі».

Калісьці, напярэдадні прыходу Гітлера да ўлады і на працягу першага года фашысцкага рэжыму, дробная буржуазія, дробныя гандляры падтрымлівалі Гітлера, яны чакалі ад яго сапраўдных «цудаў». Крамы, магазіны з'яўляліся часта невялікімі, але істотнымі апорнымі пунктамі фашысцкай агітацыі.

Зараз настроі дробных гандляроў рэзка змяніліся. Зніклі ранейшыя аптымістычныя настроі. Гаспадары крам, якія некалькі год назад праслаўлялі фашызм, зараз вельмі песімістычна глядзяць на будучыню, безнадзейным тонам гавораць аб цяперашнім становішчы і далейшых перспектывах.

Такія настроі ў масе дробнай буржуазіі тлумачацца не толькі цяжкім гаспадарчым становішчам, харчовым крызісам і боязню вайны. Справа ў тым, што шматлікая праслойка германскага насельніцтва, звязаная з дробным і сярэднім рознічным гандлем, асабліва востра адчувае ўвесь цяжар мерапрыемстваў фашысцкага ўрада. Ад свістапляскі рэпрэсій і рэгламентацыі побач з масавым спажыўпом перапіць і дробны гандляр. Катастрафічнае становішча масы гандляроў на чэцвертым годзе фашысцкага рэжыма адбіваецца не толькі на настроях гэтай часткі насельніцтва, але і на радзе арганізацый, якія яднаюць дробную буржуазію і сумежныя з ёю пласты насельніцтва.

Можна лічыць бясспрэчным, што блізкае банкрутства гаспадарчай палітыкі германскага фашызма прывядзіць да таго, што гітлераўцы ўсё быстрэй трацяць тую масавую апору, якую яны мелі, калі прышлі да ўлады.

ХТО ВЫЙГРАЎ АД МАНЧЖУРСКАЙ АВАНТУРЫ?

В. Матылёў у «Правде» прысвячае артыкул разгляду эканамічных доследаў, выпушчаных буйнейшым канцэрнам Японіі Міцубісі, аб становішчы японскага пролетарыята і сялянства.

Канцэрн у сваіх доследах на працягу 640 старонак дае абшырны матэрыял, які характарызуе эканамічнае становішча Японіі.

У кнізе паказана, што на працягу 4 год пасля акупацыі Манчжурыі рознічныя цэны павысіліся на 15,6 проц., аптовыя—на 36,7 проц., а стаўкі зарплаты за гэты-ж перыяд павысіліся на 10,4 проц. Бюро эканамічных доследаў канцэрна Міцубісі прызнае, што рабочы дзень у Японіі больш доўгі, чым у іншых капіталістычных краінах. У той час, як у Злучаных Штатах Амерыкі сярэдні лік рабочых гадзін у тыдзень складае 39 гадзін, у Японіі ён дасягае 62.2.

Заслугоўвае ўвагі характарыстыка беспрацоўя, якую дае канцэрн Міцубісі. У верасні 1935 года колькасць беспрацоўных па далёка няпоўных афіцыяльных даных складала 366.000 чалавек, або 4,5 проц. рабочага насельніцтва Японіі. Аўтары доследаў самі заяўляюць, што «Тэндэнцыя рабочых пры пераходзе іх у рады беспрацоўных варочацца да сваіх сем'яў або сваякоў па вёску робіць немагчымым складанне нават прыблізнай статыстыкі беспрацоўя».

Такім чынам, канцэрн Міцубісі прымушан прызнаць пагаршэнне становішча рабочых мас з часу манчжурскай авантуры. Рабочыя масы на сваіх плячах [illegible] увесь цяжар імперыялістычных авантур.

Бюро эканамічных доследаў канцэрна адзначае таксама дэградацыю сельскай гаспадаркі ў Японіі. З агульнага ліку гаспадарак, занятых земляробствам, 31 проц. апрацоўваюць уласную зямлю, 27 проц. складаюць арандатары і 42 проц. поўарандатары. Запазычанасць гаспадарак дасягнула вельмі вялікай лічбы — 6 мільярдаў іен, або 1.000 іен на гаспадарку. Такім чынам і сялянства прайграла ад манчжурскай авантуры, несучы разам з пролетарыятам цяжар імперыялістычнай экспансіі.

Хто-ж выйграў ад акупацыі Манчжурыі? У гэтых адносінах асаблівай увагі заслугоўваюць табліцы, якія характарызуюць нормы прыбытку ў прамысловасці. Гэтыя нормы прыбытку па раду галін прамысловасці за чатыры гады ўзраслі ў паўтара-два разы і дасягнулі значна большых размераў, чым нормы прыбытку ў іншых капіталістычных краінах. Значыць, фінансавая алігархія, буйная буржуазія пажынаюць плады імперыялістычных авантур.

Кніга канцэрна Міцубісі дае, наперакор намерам яе выдаўцаў, каштоўны матэрыял для адказу на пытанне аб сапраўдных стымулах экспансіі Японіі.

Гэтыя стымулы—карыслівыя інтарэсы імперыялістычных груп, якія дабіваюцца панавання на суседніх рынках і захвату чужых тэрыторый любой цаной.

На менскай кандзіцерскай фабрыцы «Комунарка» пачалі масавы выпуск падарункаў да новагодняй ёлкі. НА ЗДЫМКУ: брыгада работніц за ўпакоўкай цукерак да новагодніх ёлак.
Фото Боркіна (БСФ).

У ПУШКІНСКІМ КАМІТЭЦЕ БССР

Учора пад старшынствам прэзідэнта Акадэміі навук БССР акадэміка І. З. Сурта адбылося пасяджэнне ўрадавага Пушкінскага камітэта. На пасяджэнні прысутнічалі нарком асветы тав. Дзякаў, акадэмік Якуб Колас, паэты Александровіч Харык, заслужаны артыст рэспублікі Літвінаў і інш.

Паэт Александровіч паведаміў камітэту аб тым, што лепшыя пісьменнікі Совецкай Беларусі працуюць над перакладам твораў Пушкіна на беларускую мову. У гэтую работу актыўна ўключыліся і народныя паэты рэспублікі Янка Купала і Якуб Колас, якія перакладаюць на беларускую мову «Полтаву» і «Медный всадник». Тав. Александровіч перакладае «Руслана и Людмилу». Да стагоддзя з дня смерці Пушкіна выйдзе з друку на беларускай мове двухтомнік выбраных твораў паэта — паэзіі і прозы. Паасобна выходзяць «Казкі» Пушкіна. Рад яго твораў выйдзе з друку на яўрэйскай мове.

Пушкінскі камітэт рашыў склікаць 28 снежня разам з праўленнем саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і прадстаўнікамі грамадскасці пашыранае пасяджэнне для заслухоўвання перакладаў Пушкіна па беларускую мову. Пасяджэнне адбудзецца ў Доме пісьменніка.

Тав. Дзякаў інфармаваў аб падрыхтоўцы да пушкінскіх дзён у школах. У школах, тэхнікумах, інстытутах ідзе глыбокае вывучэнне твораў Пушкіна. У радзе школ Менска, Гомеля і іншых гарадоў і раёнаў рэспублікі створаны пушкінскія камісіі, арганізаваны пушкінскія куткі, рыхтуюцца літаратурныя вечары, інсцэніроўкі і т. д.

Камітэт даручыў Наркамату асветы БССР пыркова праверыць падрыхтоўку да юбілею ва ўсіх школах. На бліжэйшым пасяджэнні камітэта будуць заслуханы паведамленні па гэтаму пытанню двух інстытутаў і трох школ.

ДА СТАГОДДЗЯ З ДНЯ СМЕРЦІ А. С. ПУШКІНА

Больш 300 калгаснікаў прыняло ўдзел у вечары, прысвечаным памяці А. С. Пушкіна, які адбыўся ў Латыгальскім доме соцкультуры (Сенненскі раён). Пасля даклада аб творчасці паэта драмгурткам была арганізавана пастаноўка п'есы «Шаспёра любімых». Вечар прайшоў добра.

П. ЛІСАЎ.

***

На скурзаводзе імя Сталіна (Магілеў) праводзіцца значная работа па вывучанню творчасці вялікага паэта. Будзе праведзен рад дакладаў. 11 снежня ўжо прачытан даклад для 150 рабочых дзеларчнага цэха. Таксама будзе зроблен даклад на агульназаводскім сходзе моладзі. Комсамольскі камітэт арганізаваў чытку твораў паэта ў групах. У бібліятэцы больш патрабуюць такіх твораў, як «Капітанская дачка», «Еўгеній Онегін», «Дуброўскі» і інш.

ОСІНОЎСКІ.

***

У Струкачоўскай НСШ (Карма) рыхтуецца пушкінскі вечар, на якім будзе арганізавана мастацкая чытка і дэкламацыя твораў паэта. Пушкінскія вечары рыхтуюцца ў калгасах імя Розы Люксембург, імя 17 партз'езда і інш.

І. КАВАЛЁЎ.

***

Пушкінскі вечар праведзен ў другой брыгадзе калгаса імя Сталіна, Брунскага раёна. Калгаснікам прачытан даклад аб творчасці паэта. Калгаснік сельгасартелі «Чырвоны Герт» Гара Дзям'ян набыў вялікі партрэт А. С. Пушкіна. У м. Крупкі рыхтуюцца выстаўкі і вітрыны.

М. КАЛАЧЫНСКІ.

ВАЕННА-ВУЧЭБНЫ ПУНКТ

На стале перад ваенным камісарам Крычаўскага райваенкамата інтэндантам 2 ранга тав. Таненбергам стаіць у прыгожай аправе гадзіннік. На гадзіннику надпіс: «Крычаўскаму райваенкому тав. Таненбергу за ўзорнае правядзенне прызыву ў 1934 г. ад наркома абароны».

Вось ужо на працягу апошніх трох год крычаўскі ваенна-вучэбны пункт з'яўляецца перадавым у БССР па падрыхтоўцы пісьменных і фізічна моцных байцоў Чырвонай Арміі. За прызыў 1935 года нарком абароны таксама ўзнагародзіў райваенкома каштоўным падарункам і яму аб'яўлена падзяка. Добрыя вынікі даў прызыў і ў 1936 г. З Крычаўскага раёна Чырвоная Армія атрымала поўнацэннае папаўненне.

«Мы, учарашнія прызыўнікі, зараз байцы Асобай Чырвонаспяжнай Далёкаўсходняй Арміі, — пішуць у калектыўным пісьме на імя райваенкома 10 лепшых нядаўніх прызыўнікоў Крычаўскага раёна Шаршнёў, Філіпенка і іншыя, — шлём Вам чырвонаармейскае прывітанне і падзяку за аказанае нам давер'е ахоўваць Далёкаўсходнія рубяжы нашай радзімы. Няма лепшага гонару, як служба ў радах Чырвонай Арміі і асабліва ў радах ОКДВА. Мы далі абяцанне камандванню Н-скага батальёна, што будзем прыкладнымі байцамі ва ўладанні тэхнікай сваёй справы.

Запэўняем вас, што з гонарам апраўдаем аказанае нам давер'е і станем у рады лепшых стаханаўцаў батальёна па рабоце і вучобе. І калі вораг паспрабуе напасці на нашу радзіму, мы гатовы абараняць да апошняй кроплі крыві свяшчэнныя граніцы Совецкага Саюза».

Такія пісьмы ад сваіх прызыўнікоў у райваенкамаце атрымліваюць вельмі часта. Першая баявая і палітычная грамата, атрыманая на ваенна-вучэбным пункце, цесна звязвае іх з райваенкаматам і раённым советам Асоавіяхіма на ўвесь час службы ў Чырвонай Арміі. У сваіх пісьмах яны дзеляцца сваімі поспехамі ў баявой і палітычнай вучобе, дзеляцца сваёй радасцю. Праз гэтыя пісьмы адбываецца моцная сувязь з часцямі Чырвонай Арміі дапрызыўнікаў, якія зараз на пункце рыхтуюцца стаць байцамі Чырвонай Арміі.

Н. ВІШНЕЎСКІ.

ПЕРАМОГА МАШЫНІСТА БАЙКАЧОВА

ГОМЕЛЬ. (Па тэлефону). Ініцыятар калоны двухтысячнікаў, ордэнаносец Жлобінскага дэпо машыніст Байкачоў атрымаў 17 снежня новую бліскучую перамогу. Ён узяў на ст. Калінкавічы поезд вагой 2095 тон (норма 1400 тон) і прывёў яго ў Жлобін з нагонам у дарозе 10 мінут. 19 снежня т. Байкачоў правёў поезд вагою ў 2080 тон з Калінкавіч у Жлобін без астаноўкі для набору вады і чысткі топкі. Ён нагнаў у шляху 52 мінуты, маючы на тэндэры паравоза 80-процантны вугаль. Так, практычнай работай адказвае ордэнаносец Байкачоў на зварот дэлегатаў VIII З'езда Советаў — чыгуначнікаў аб палепшанні работы транспарта.

ГІЗУНТЭРМАН.

БУДАЎНІЦТВА ГІДРАЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ Ў КАЛГАСЕ „ЛЕНІНСКІ ПРЫЗЫЎ"

* Соўнарком БССР дазволіў Наркамзему пачаць будаўніцтва гідраэлектрастанцыі на рацэ Сешні ў калгасе «Ленінскі прызыў», Сіроцінскага раёна. Будаўніцтва станцыі павінна быць закончана ў 1937 годзе. Беларускай канторы Сельгасбанка даручана прадставіць калгасу неабходныя крэдыты на будаўніцтва.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ АЛІМПІЯДА ЧЛЕНАЎ ПРАМЫСЛОВЫХ АРЦЕЛЕЙ

22 снежня ў клубе імя Сталіна ў Менску адкрылася ўсебеларуская алімпіяда самадзейнага мастацтва членаў прамыслова-кааператыўных арцелей. У алімпіядзе прымуць удзел каля 300 танцораў, музыкантаў, расказчыкаў, з'ехаўшыхся з розных гарадоў і мястэчак БССР. Алімпіяда працягнецца 4—5 дзён.

КАНДЫДАТЫ У АКАДЭМІКІ

23 снежня ў Маскве адкрываецца сесія Акадэміі навук СССР, на якой будуць праведзены выбары новых сапраўдных членаў Акадэміі. Радам навуковых і грамадскіх арганізацый высунуты кандыдатуры ў акадэмікі: Е. С. Варга — па кафедры эканомікі і Е. Б. Пашуканіса — па кафедры совецкага права.

РЭКОРДЫ КАЛГАСНЫХ ЖЫВЁЛАВОДАЎ

Свінаферма калгаса «Юны тварэц» (Аршанскі раён) дабілася сёлета выключных поспехаў. 20 свінаматак прывялі 481 парасё — 24 парасяты на кожную свінаматку.

Па 2500 літраў малака надоена ў сярэднім ад кожнай каровы на ферме калгаса «Чырвоная Жэжніца» (Лепельскі раён), а 12 кароў далі па 3500 літраў малака.

Па трое ягнят прывялі ўсе 40 авечак калгаса імя Сталіна (Ушацкі раён). Усе 120 ягнят гадуюцца.

Наркамзем БССР прэміраваў работнікаў гэтых ферм грашыма. (БЕЛТА).

Ад парткалегіі пры уп. КПК па БССР

Ніжэйпералічаныя ў спіску таварышы выклікаюцца на пасяджэнне Вызной парткалегіі пры ўп. КПК пры ЦК ВКП(б) па БССР (памяшканне ГК КП(б)Б) у г. Гомель на 28 снежня 1936 г. у 10 гадзін раніцы для разбору іх апеляцыйных спраў: Басаў А. Ш., Фломбаум Е. Е., Бурый А. Ф., Кушнераў Л. К., Андрусенка П. Г., Гестрын Ш. А., Гаўрылаў. Власаў К. А. (Гомель), Белы Н. Т. (Рэчыца), Крупецкі П. Д., Старасценка (Церахоўка), Халодка М. П. (Парычы), Далуйка В. Л. (Брагін), Шэйн Г. А. (Камарын), Быхаўнаў Г. С., Цімаховіч І. В. (Уваравічы), Гінзбург Я. Е., Герштэйн С. М., Шпайзман І. (Мозыр), Вішнеўскі Я. І. (Карма), Шабулдаеў С. В. (Чачэрск), Ланіцкі М. М. (Ветка).

Парткалегія пры уп. КПК па БССР.

ДЗЁННІК

— **Консультацыя для прапагандыстаў горада** па пытанню аб міжнародным становішчы (адарэнні ў Кітаі і Іспаніі) адбудзецца 25 снежня ў 7 гадзін вечара ў памяшканні дома партактыва (пакой № 20).

— **Заняткі гуртка па ленінізму** адбудуцца ў Доме партактыва Менгаркома КП(б)Б 23 снежня ў 7 гадзін вечара (пакой № 21). Яўка таварышоў, якія запісаліся ў гэты гурток, абавязкова.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

Беларускі першы дзяржаўны тэатр.
Адкрыццё зімовага сезона.
27 снежня
Абонемент № 1
А. Остроўскі.
ВАЎКІ І АВЕЧКІ
Каса адкрыта з 12 да 2 і з 5 да 8 гадзін вечара. Прадаюцца пастаянныя месцы.

Белдзяржтэатр оперы і балета
КАНЁК-ГАРБУНОК

Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР
ЛЮДЗІ У БЕЛЫХ ХАЛАТАХ

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка»
„ЗАКЛЮЧЕННЫЕ"

Дзіцячы гукавы кінотэатр
МЫ З КРАНШТАТА

Гукавы кінотэатр «Пролетарый»
„БОРЦЫ"

Гукавы кінотэатр «Спартак»
СЫН МАНГОЛІІ

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал»
КАІН І АРЦЕМ

ДА ЎВАГІ ПАКУПНІКОЎ!
У мэтах лепшага абслугоўвання пакупнікоў і ліквідацыі недахопаў у рабоце
АБУТКОВЫ МАГАЗІН № 11 МЕНСКАЙ КАНТОРЫ БЕЛПРАМГАНДЛЯ
СКЛІКАЕ 25 снежня, у 8 гадзін вечара, у памяшканні магазіна (Ленінская, 4)
КАНФЕРЭНЦЫЮ ПАКУПНІКОЎ.
СУМЕСНА З ПРАДСТАЎНІКАМІ ПРАМЫСЛОВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ.
ПРОСЬБА ДА ЎСІХ ПАКУПНІКОЎ МАГАЗІНА № 11 ПРЫНЯЦЬ УДЗЕЛ У РАБОЦЕ КАНФЕРЭНЦЫІ.

ДНЕПРА-ДЗВІНСКАЕ РЭЧНАЕ ПАРАХОДСТВА
ПАВЕДАМЛЯЕ, што ў адпаведнасці з зацверджаным на 1937 год грузаабаротам яно з 20 СНЕЖНЯ г. г.
ПРЫСТУПІЛА ДА ЗАКЛЮЧЭННЯ ДАГАВАРОЎ
на перавозку грузаў
як у чыста водных зносінах, так і ў прамых змешаных чыгуначных водных па ўсіх рэках басейна.
З прычыны неабходнасці размеркаваць флот па ўчастках для забеспячэння перавозак рэкамендуецца аформіць свае перавозкі дагаварамі без затрымкі.
К дагавору неабходна прыкласці план перавозак па родах грузу з размеркаваннем іх па перыядах: красавік-май, чэрвень і астатнюю колькасць на другі перыяд.
Дагаворы заключаюцца:
рэспубліканскага значэння па басейну — г. Гомель, вул. Арцема, 17, Кіраўніцтва ДДРП;
па мясцовых перавозках — прыстанямі параходства.
КІРАЎНІЦТВА ДДРП.

EXPOSITION INTERNATIONALE
PARIS 1937
ШИРОКО БУДУТ ПРЕДСТАВЛЕНЫ ИСКУССТВО, НАУКА, ЛИТЕРАТУРА И СПОРТ
МАЙ-НОЯБРЬ 1937

ПАСТАНОВА № 35
ПРЭЗІДЫУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА ад 10 снежня 1936 года.

Аб дапаўненні абавязковай пастановы горсовета № 20 ад 10-IV 1936 г. «Аб абавязковым медагляде для работнікаў харчовай прамысловасці, комунальных прадпрыемстваў і дзіцячых устаноў».

Менскі горсовет **пастанаўляе:**

У адпаведнасці з пастановай СНК СССР ад 1 кастрычніка 1936 г. «Аб абавязковым медыцынскім агляде асоб, занятых у харчовай справе, у прадпрыемствах па санітарна-гігіенічнаму абслугоўванню насельніцтва і на збудаваннях па водазабеспячэнню» і пастановы СНК БССР ад 19 кастрычніка 1936 г. Менскі гарадскі совет пастанаўляе:

1) Дапоўніць п. 1 абавязковай пастановы горсовета № 20 ад 10 красавіка 1936 г. «Аб абавязковым медагляде для работнікаў харчовай прамысловасці, комунальных прадпрыемстваў і дзіцячых устаноў г. Менска» абзацам другім у наступнай рэдакцыі:

«1) Таксама медыцынскаму агляду падлягаюць члены арцелей і саматужнікі-адзіночкі, працуючыя па вырабу, хаванню, транспартыроўцы, па гандлю харчовымі прадуктамі, а таксама па санітарна-гігіенічнаму абслугоўванню насельніцтва і на збудаваннях па водазабеспячэнню».

2) Пункт 2 указанай пастановы дапоўніць другім абзацам у наступнай рэдакцыі:

«Члены арцелей і саматужнікі-адзіночкі, указаныя ў п. 1 гэтай пастановы, абавязаны мець на руках кніжкі медагляду адпаведнага ўзору, устаноўленага дзяржсанінспекцыяй з наклеенымі і засведчанымі фотакарткамі».

3) Пункт 4 пастановы дапоўніць другім абзацам у наступнай рэдакцыі:

«Адміністрацыя прадпрыемстваў, дзе медагляд дзяржсанінспекцыяй праводзіцца на самім прадпрыемстве, абавязана прадаставіць адпаведнае для гэтай мэты памяшканне і абсталяванне».

Нам. старшыні горсовета ДРАБЫШЭЎСКІ.
Сакратар горсовета КАЗЛОЎСКІ.

МЕНСКІ НАСТАЎНІЦКІ ІНСТЫТУТ
абвяшчае НАБОР
на падрыхтоўчыя КУРСЫ.
Паступаючыя на курсы трымаюць іспыты па рускай мове і літаратуры, матэматыцы, фізіцы, хіміі, гісторыі і палітграмаце (для яўрэйскага і польскага аддзяленняў і па роднай мове) у аб'ёме 9 класаў сярэдняй школы.
Іспыты — з 25 студзеня 1937 года.
Заявы з усімі дакументамі накіроўваць па адрасу: Менск, Валадарскага, 5, настаўніцкаму інстытуту.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Уп. Галоўлітбела № К—5817. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. К., К., С.